КУЛЬТУРА

"ЗА ДУХОЎНАЕ АДРАДЖЭННЕ"
ЛАЎРЭАТ ПРЭМІІ

WWW.KIMPRESS.BY
ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА
1991 г. / № 7 (1342)
17 лютага 2018 г.

Вуліца Марка Шагала, 5а.

"Клином красных бей белых" Эля Лісіцкага ў каляровым граніце.

Музей перамогі над Сонцам

Урачыстага адкрыцця Музея гісторыі Віцебскага народнага мастацкага вучылішча, якое адбылося на мінулым тыдні, чакалі даўно, а меркаваныя тэрміны гэтай падзеі не раз пераносіліся. Галоўная прычына — са сферы фінансаў. Мультымедыйныя тэхналогіі, якія ствараюць неабходны эфект прысутнасці, патрабавалі немалых укладанняў.

Але адразу пасля пераразання сімвалічнай чырвонай стужкі становіцца зразумелым, што яны сябе апраўдалі. Звычайны наведвальнік здзіўлена застывае перад мноствам сэнсарных экранаў, праекцый, тач-сталоў ды іншага мудрагелістага абсталявання. Яно дазваляе акунуцца ў атмасферу жыцця праслаўленых мастакоў і педагогаў легендарнай вучэльні. Дзякуючы намаганням рэстаўратараў і майстроў інфармацыйных тэхналогій, гэтыя постаці нібы паўстаюць з небыцця. І ўся лічбавая разнастайнасць прапануе неверагодны маршрут падарожжа — у будучыню праз спасціжэнне мінулага.

— Тая канцэпцыя, з якой мы прыступілі да рэстаўрацыі ў 2013 годзе, была ўвасоблена практычна поўнасцю, — так дырэктар Віцебскага цэнтра сучаснага мастацтва Андрэй Духоўнікаў ахарактарызаваў дасканала праведзеныя работы.

Першая экспазіцыйная зала "Віцебск пачатку XX стагоддзя".

Заканчэнне — **на старонках 2 — 3.**

ВЫБАРЫ-2018!

ст. 5

Соцыум

"КАМЯНІ СПАТЫКНЕННЯ" Ў ВІХУРЫ ЧАСУ

Першыя на Беларусі "Камяні спатыкнення" неўзабаве маюць быць усталяваныя ў Гродне. "К" піша пра знакі памяці ахвяр нацыянал-сацыялізму і праект нямецкага мастака Гунтэра Дэмніга.

ст. 4

Суботнія сустрэчы

"Я САМ САБЕ КАНКУРЭНТ!"

Маэстра Міхаіл ФІНБЕРГ — пра малую радзіму, "бітлоў" і прафесіяналізм.

ст. 6

а"К"но ў свет

"ЛЕСВІЦА Ў НЕБА" НАД ДНЯПРОМ

Сцэнарыст і рэжысёр Уладзімір АРЛОЎ падзяліўся з "К" дарожнымі нататкамі пра паездку на Міжнародны фестываль дакументальных фільмаў "Кінаасамблея на Дняпры-2018".

ст. 12

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ.

З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").

(Заканчэнне.
Пачатак на старонцы 1.)

Музей перамогі над Сонцам

Старшыня Віцебскага гарвыканкама Віктар Нікалайкін, старшыня Віцебскага абласнога савета дэпутатаў Уладзімір Цярэнцьеў і начальнік галоўнага ўпраўлення культуры і аналітычнай работы Міністэрства культуры Васіль Чэрнік на адкрыцці музея.

ДОЎГАЯ ПАДРЫХТОЎКА

Варта адзначыць, што віцебскае грамадскае асяроддзе загадзя рыхтавалася да з'яўлення такога незвычайнага і па тэматыцы, і па напаўненні музея. Шэраг імпрэзаў, якія праводзіліся ў горадзе, прама ці ўскосна яму папярэднічалі. Адразу пасля Летняга Сонцастаяння 2016 года ў будынку, які тады яшчэ знаходзіўся на рэканструкцыі, адбылася акцыя Руслана Вашкевіча "Перамога над Сонцам". Само перайменаванне

У гэтых пакоях калісьці жылі выкладчыкі вучылішча.

Ванны пакой на другім паверсе.

часткі вуліцы Праўды ў гонар Марка Шагала, адкрыццё яго мемарыяльнай дошкі і ўрачыстыя мерапрыемствы, прысвечаныя гэтым падзеям, таксама прадэманстравалі культурныя прыярытэты горада.

Рэгулярна ладзіліся і мерапрыемствы адукацыйнага характару — як, напрыклад, "Эль Лісіцкі — творца проўнаў" у Віцебскай абласной бібліятэцы, прысвечанае 125-годдзю з дня нараджэння мастака. Можна таксама ўзгадаць выставачны праект "Над Сонцам. Казімір Малевіч — спадчына і ўплыў на мастакоў Захаду", арганізатарам і куратарам якога сумесна з Віцебскім цэнтрам сучаснага мастацтва стаў ірландскі мастак Шон Ханрахан.

У сваім выступе на адкрыцці музея старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Цярэнцьеў распавёў, што ідэя такой установы даўно лунала ў паветры, а вось яе ўвасабленне спазнала немалыя складанасці. Зрэшты, паводле яго слоў, усе яны кампенсуюцца ўнікальнасцю самога музея.

— Мы нават сёння, у дзень адкрыцця, недаацэньваем важнасць гэтага аб'екта для ўсёй нашай краіны, — адзначыў спадар Цярэнцьеў.

Старшыня Віцебскага гарвыканкама Віктар Нікалайкін ахарактарызаваў з'яўленне новага музея як гістарычную падзею для горада. Начальнік галоўнага ўпраўлення культуры і аналітычнай работы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Васіль Чэрнік трапна заўважыў, што Віцебск асацыіруецца не толькі са "Славянскім базарам", але таксама і з цэлай плеядай знакавых для сусветнай культуры мастакоў.

І ўсе прамоўцы, зразумела, казалі пра перспектывы пашырэння турыстычнай плыні дзякуючы з'яўленню гэтага ўнікальнага аб'екта. Што і нядзіўна. Як адзначыў Андрэй Беларусь Аляксандра Косінца, які, будучы раней старшынёй Віцебскага аблвыканкама, вельмі шмат зрабіў для ўвасаблення ў жыццё ідэі стварэння музея.

Зрэшты, па словах Андрэя Духоўнікава, спіс удзельнікаў "талакі" гэтым не вычэрпваецца. У прыватнасці, істотна спрычыніліся да завяршэння работ і цяперашні старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай Шарстнёў і Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Французскай Рэспубліцы Павел Латушка, які раней займаў пасаду міністра культуры.

Духоўнікаў, паломніцтва замежных мастацтвазнаўцаў, журналістаў, дакументалістаў да будынка вучэльні не супыняецца ва ўсе поры года. А цяпер ён будзе цікавы не толькі спецыялістам. Адсюль актуальнасць як культурная, так і ў чыстым выглядзе прагматычная.

РЭКАНСТРУКЦЫЯ ТАЛАКОЮ

У дачыненні да ходу рэканструкцыі музея Уладзімір Цярэнцьеў прамовіў такое чароўнае беларускае слова, як "талака". Пачынаючы з 2013 года, прадстаўнікі абласной і гарадской адміністрацый, работнікі культуры, арганізацыі "Віцебскгандльбуд" і "Віцебскграмадзянпраект", а таксама фізічныя асобы аб'ядналі свае намаганні, каб гэты жаданы аб'ект у горадзе адкрыўся. Старшыня аблсавета адзначыў значную ролю цяперашняга памочніка прэзідэнта Рэспублікі

СЦЕНЫ ЯК АРТЭФАКТ

— Гэта адзін з самых важных будынкаў у гісторыі нашай культуры, — адзначыў дырэктар музея. — У нас, вядома, ёсць шмат прыгожага ў краіне, але тут мы маем проста неверагодную канцэнтрацыю вялікіх імёнаў, якія паўплывалі на ўсё далейшае развіццё сусветнага мастацтва. Аналагаў гэтаму сапраўды няма.

У розныя гады з'яўляліся дырэктарамі гэтай навучальнай установы Мсціслаў Дабужынскі і Марк Шагал. З ліку выкладчыкаў дастаткова назваць Казіміра Малевіча, Эль Лісіцкага, Веру Ермалаеву, Давіда Якерсона. Гэтыя асобы паўплывалі не толькі на мастацкі працэс, але і на развіццё дызайну, вонкавай рэкламы, плаката, сцэнаграфіі і гэтак далей.

Аднак часцей за ўсё самае галоўнае ў іх канцэптуальнай дзейнасці або не ўганароўваюць увагай, або замоўчваюць — не столькі знарок, колькі з прычыны зразумелых цяжкасцяў у разуменні сутнасці дзіўнага метанаратыву першых рэвалюцыйных гадоў.

У поўнай адпаведнасці з рэвалюцыйным пафасам таго перыяду, "сцвярджа-

Газета КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА) Выдаецца з кастрычніка 1991 года.
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Галоўны рэдактар — Ілья Васільевіч СВІРЫН; **намеснік галоўнага рэдактара** — Вераніка МОЛАКАВА; **адказны сакратар** — Юрый КАРПЕНКА; **рэдактары аддзелаў:** Надзея БУНЦЭВІЧ, Яўген РАГІН; **аглядальнікі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Настасся ПАНКРАТАВА, Генадзь СІВОХІН, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльныя карэспандэнты:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ; **карэспандэнт** — Ганна ШАРКО; **фотакарэспандэнт** — Сяргей ЖДАНОВІЧ; **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД; **карэктар** — Мая ХУТКОВА.
Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".
Дырэктар — СЛАБОДЗІЧ Ірына Аляксееўна;
першы намеснік дырэктара — КРУШЫНСКАЯ Людміла Аляксееўна. Прыёмная: (017) 334 57 41.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. *Матэрыял на правах рэкламы.
©"Культура", 2018.
Наклад 4 072. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці. Падпісана ў друк 16.02.2018 у 19.30. Замова 471.
Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

Па віцебскай модзе

У Віцебскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці на мінулым тыдні адбылася прэзентацыя кнігі "Традыцыйнае адзенне Віцебшчыны".

Укладальнікі зборніка: Людміла Вакар, Святлана Салаўёва, Ніна Бабровіч, Галіна Бабровіч.

Яўген РАГІН

"К" даўно разважае ды аналізуе, як далей развівацца раённым дамам рамёстваў. А Віцебская вобласць з'яўляецца неаспрэчным заканадаўцам рамесніцкай моды. Менавіта тут першай у рэспубліцы ўзнікла сетка РДР. Глыбоцкаму дому рамёстваў — першаму ў краіне — споўнілася ўжо 26 гадоў. Дык вось, развіваюцца ўстановы вобласці (як і іншыя па Беларусі) у кірунку ўдасканалення сваіх лакальных традыцыйных рамёстваў, але паралельна займаюцца адраджэннем і рэканструкцыяй мясцовага нацыянальнага касцюма. Дзеля справядлівасці варта адзначыць, што гэтай жа пачэснай справай заклапочаны і ў іншых абласцях. Аднак Віцебшчына зноўтакі першай давяла справу да лагічнага завяршэння.

Кніга "Традыцыйнае адзенне Віцебшчыны" днямі выйшла ў свет накладам у 500 асобнікаў за кошт гранта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Гэта калектыўная праца народных майстроў, навукоўцаў, музейшчыкаў. Неацэнную дапамогу аказалі спецыялісты Смаленшчыны і Пскоўшчыны, з якімі Віцебская вобласць суседнічае. Цягам ці не дзесяці гадоў кожны раён узнаўляў касцюмы сваёй мясцовасці. Для таго, каб высілкі былі не марнымі, ладзіліся агульныя канферэнцыі, семінары, святы і выставы народнага касцюма.

У кніжцы прэзентуюцца выявы мужчынскіх і жаночых вопратак, летніх, зімовых, вясельных. У пэўных раёнах рэканструяваны нават дзіцячыя касцюмы. У тым самым Глыбокім узноўлены сялянскія (мужчынскі і жаночы) касцюмы XII — XIII стагоддзяў, касцюмы (летні, зімовы) паненкі 1930-х гадоў, жаночы і мужчынскі 1940-х гадоў. К

льнікамі” пераглядалася ўся класічная канцэпцыя чалавека. На першы план выходзіў праметэеўскі імпульс. Асоба парывала з ранейшым псіхалагізмам і культурай буржуазнага грамадства, будуючы цалкам новае асяроддзе. Сонца як бачнае боства закрывалася чорным квадратам Малевіча, які азначаў канец усім ранейшым законам перцэпцыі ў імя пераўтварэння свету. Вобразы будзятлян з футурыстычнага спектакля-оперы “Перамога над Сонцам”, увасобленых у розныя часы Казімірам Малевічам, Верай Ермалаевай і Эль Лісіцкім, вычарпальна выяўляюць ідэю “новага чалавека”.

Яшчэ не так даўно нават віцябляніну было цяжка паверыць, што ўсе гэтыя тэктанічныя зрухі свядомасці адбываліся тут, на знаёмай для яго вуліцы Праўды. Але музей са сваім беспрэцэдэнтна смелым для Беларусі дызайнам экспазіцыі дазваляе адчуць тую эпоху.

Звыклая для такіх установаў задача захаваць памяць аб мінулым у дадзеным выпадку вельмі няпростая. Артэфактаў з таго часу ў Віцебску няма — як і арыгінальных работ знакамітых на ўвесь свет мастакоў. Арыгінальнымі, па сутнасці, засталіся толькі сцены будынка. Усё астатняе — вынік грунтоўнай рэканструкцыі помніка архітэктуры пачатку XX стагоддзя. Без сумневу, галоўным экспанатам музея з’яўляецца ён сам — той дом, які належаў банкіру Ізраілю Вішняку і быў у 1918 годзе нацыяналізаваны пад патрэбы вучылішча.

Музею давядзецца стаць таксама і навукова-даследчым цэнтрам, які канцэнтруе разнастайную інфармацыю, звязаную з гісторыяй ВНМВ і аб’яднання УНОВИС. І, вядома, тут будзе збірацца і аналізавацца ўсё звязанае з далейшай дзейнасцю кожнага са “сцвярджальнікаў” і іх уплывам на тэндэнцыі развіцця сусветнай культуры ды сучаснага мастацкага жыцця. І, хочацца верыць, — таксама і крыніцай яго натхнення.

Георгій КАРЖАНЕЎСКІ
Фота Уладзіміра ЗАЛОЗНАГА
Віцебск

“Пакуль не ідуць цітры...”

Чацвёрты раз у Мінску з 24 па 27 лютага пройдзе фестываль класічнай музыкі, прысвечаны памяці таленавітай піяністкі Алены Цагалка. “Пакуль не ідуць цітры” — гэта словы самой Алены, якая была ўпэўнена, што ў жыцці ўсё магчыма — да самага апошняга яго моманту.

Іна НАРКЕВІЧ

Яе жыццё было вельмі кароткім. Але пражыла яна яго з вялікім сэрцам і вельмі светлай душой. Пра гэта ўзгадваюць сябры Алены — тыя, хто вучыўся з ёю разам у Гімназіі-каледжы мастацтваў імя Івана Ахрэмчыка ці ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі і хто потым аб’яднаўся дзеля стварэння фестывалю, каб захаваць памяць пра таленавітую піяністку і дапамагчы тым, каму гэта неабходна сёння.

Адкрыццё фестывалю “Пакуль не ідуць цітры” адбудзецца 24 лютага ў Малой зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі, дзе пройдзе канцэрт камернай музыкі. Наступная імпрэза — 27 лютага: у Вялікай зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі выступіць Канцэртны сімфанічны аркестр. Салісты — Аляксандр Рам (Масква), Арсеній Харытонаў (ЗША), Варвара Няпомняшчая (Германія). Дырыжор — Юрый Караваеў.

Усе канцэрты дабрачынныя, атрыманыя сродкі ідуць на лячэнне дзяцей з анкалагічнымі захворваннямі. Падмуркам для іх сталі вечары памяці ў Гімназіі-каледжы мастацтваў. Менавіта так іх арганізатарка Ганна Лянькова спрабавала пераадолець унутраны боль, звязаны са стратай сяброўкі. А ў 2014-м адбыўся і першы фестываль, які складаўся з трох музычных вечароў. Праз год спецыяльна да яго сабралі канцэртны сімфанічны аркестр. Яго склад кожны год змяняецца, і шмат хто з сёлетніх аркестрантаў не ведаў Алену Цагалка асабіста. Але імя таленавітай піяністкі стала для ўдзельнікаў сімвалам адданасці творчасці, любові да музыкі і дабрачыннасці.

Тамара Мікалаеўна НІЖНІКАВА

(9 сакавіка 1925 — 15 лютага 2018)

Музычна-тэатральнае мастацтва нашай краіны панесла цяжкую страту. На 93-м годзе жыцця спынілася сэрца Тамары Мікалаеўны Ніжнікавай — народнай артысткі СССР, выдатнай опернай спявачкі, якая з’яўлялася адным з сімвалаў нацыянальнай музычнай культуры.

Тамара Мікалаеўна нарадзілася 9 сакавіка 1925 года ў горадзе Куйбышаве. У 1949 годзе скончыла Маскоўскую ордэна Леніна дзяржаўную кансерваторыю імя Пятра Чайкоўскага па класе спеваў у М. Уладзіміравай.

З 1949 па 1976 год Тамара Ніжнікава з’яўлялася салісткай Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета БССР. Валодая выключнымі прыроднымі вакальнымі дадзенымі, віртуознай тэхнікай выканання, выразнай драматычнай інтанацыяй у спалучэнні з выдатным акцёрскім майстэрствам, яна ўвасобіла на сцэне шэраг незабыўных жаночых вобразаў у операх беларускіх, рускіх і замежных кампазітараў. Сярод найбольш яркіх — Джыльда (Джузэпэ Вердзі “Рыгалета”), Віялета (Джузэпэ Вердзі “Травіята”), Разіна (Джакома Расіні “Севільскі цырульнік”), Манон (Жуль Маснэ “Манон Ляско”), Мікаэла (Жорж Бізэ “Кармэн”), Марфа (Мікалай Рымскі-Корсакаў “Царская нявеста”), Антаніда (Міхаіл Глінка “Іван Сусанін”), Ірына (Юрый Семяняка “Калючая ружа”).

У канцэртным рэпертуары Тамары Ніжнікавай значнае месца займалі творы беларускіх аўтараў і беларускія народныя песні. Значным унёскам у нацыянальнае музычна-тэатральнае мастацтва сталі выкананыя ёй партыі ў операх беларускіх кампазітараў Рыгора Пукста, Юрыя Семянякі і іншых.

Значнае месца ў жыцці Тамары Ніжнікавай займала педагагічная дзейнасць. Падчас работы ў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі імя Анатоля Луначарскага (у цяперашні час — Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі) ёй падрыхтаваны шэраг выбітных выканаўцаў, сярод якіх — народная артыстка БССР Любоў Каспорская, заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Алена Шведава, заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Алена Бундзелева, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Віктар Скарабагатаў і іншыя.

Тамара Мікалаеўна вяла актыўную гастрольную дзейнасць, выступала на канцэртных пляцоўках Беларусі і замежных краін.

Творчасць Тамары Мікалаеўны Ніжнікавай адзначана высокімі дзяржаўнымі ўзнагародамі: ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам Дружбы народаў, ордэнам Францыска Скарыны. За выдатныя творчыя дасягненні Тамары Ніжнікавай прысвоена пачэснае званне народнай артысткі Беларускай ССР (1955) і народнай артысткі СССР (1964). У 2015 годзе Т.М. Ніжнікава была ўзнагароджана медалём UNESCO “Віктор Гюго”.

Свой 90-гадовы юбілей Тамара Ніжнікава адзначыла ў 2015 годзе на сцэне Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі і была ўдастоена звання Пачэснага прафесара акадэміі.

Творчасць Тамары Мікалаеўны з’яўляецца сапраўдным культурным здабыткам нашай краіны. Яе дзейнасць аказала значны ўплыў на развіццё беларускага музычна-тэатральнага мастацтва.

Светлая памяць аб выдатнай спявачцы, народнай артыстцы СССР Тамары Мікалаеўне Ніжнікавай назаўсёды застанецца ў памяці родных, блізкіх, сяброў, калег, шматлікіх вучняў і гледачоў.

Ю.П. Бондар, К.М. Дулава, У.П. Грыдзюшка, У.П. Рылатка, Н.У. Шарубіна, Г.У. Пятроў, Н.І. Казлова, Н.І. Ламановіч, П.В. Рыдзігер, М.А. Жылюк, Л.Я. Колас, М.А. Зданевіч, Т.М. Цыбульская

Калектыў Вялікага тэатра Беларусі глыбока смуткуе і выказвае шчырыя спачуванні родным, калегам, сябрам і блізкім у сувязі са смерцю выдатнай салісткі оперы, прафесара, педагога, народнай артысткі СССР Тамары Мікалаеўны НІЖНІКАВАЙ.

Незямная зорка з усмешкай

Штосьці не так на нябёсах. Ледзь не штотыдзень сыходзіць туды хтосьці з дзеячаў беларускай культуры, пра каго можна было б сказаць: разам з ім знікла цэлая эпоха. Пазаўчора памерла народная артыстка Беларусі і СССР, знакамітая спявачка і вакальны педагог Тамара Ніжнікава. І разам з ёй сышла не адна эпоха, а адразу некалькі.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Упэўнена, пра Тамару Мікалаеўну калісьці напішуць стосы кніг: і пра яе багатае на падзеі жыццё, і пра творчасць, дасканала разабраўшы кожную з яе оперных партый, кожны з канцэртных нумароў. Пакуль жа ведаю толькі адну манаграфію, у аснове якой — дысертацыя, прысвечаная педагагічным метадам Ніжнікавай. А яшчэ — безліч артыкулаў і інтэрв’ю розных гадоў: і тады, калі Тамара Мікалаеўна была “салоўкай” нашай опернай сцэны, і калі выкладала ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі — больш за паўстагоддзя.

Мне пашчасціла кантактаваць з ёй з канца 1980-х: Тамара Мікалаеўна часцяком зазірала ў Саюз кампазітараў, дзе я тады працавала. Потым мы неаднаразова сутыкаліся і ў Акадэміі музыкі, і па-за яе сценамі, неаднаразова я рабіла з ёй інтэрв’ю... Але толькі цяпер, калі яе не стала, адчуваю, наколькі ўсяго гэтага было замала! Ну не той яна чалавек, з якім усё зразумела, што называецца, “з першага такта”. Усё акурат наадварот: чым больш я з ёй размаўляла, тым больш заўважала тыя “неразгаданыя загадкі”. Можа, менавіта ў гэтым быў сакрэт неверагоднай прыцягальнасці яе асобы?

Энергія з яе фантаніравала. Памятаю, сядзіць пасля заняткаў, чакае выкліканае таксі, бо ісці ўжо не можа, а ўсмешка — на ўвесь твар. І творчыя ідэі — адна за адной: а добра было б зрабіць тое, гэтае, а яшчэ лепей так ды гэтак... Ой, таксі прыехала — ну, наступным разам абмяркуем. Пазней ёй дазволілі пераносіць заняткі дадому. Тым больш, што жыла яна на Нямізе, пешшу туды — не далей за адлегласць да другога корпуса Акадэміі. І студэнткі спраўна да яе хадзілі, бы ў госці да маці.

Апошняе параўнанне невыпадковае. Пры ўсёй сваёй зорнасці, яна змагла захаваць папраўдзе матчына стаўленне да ўсіх, хто аказваўся побач — нават выпадкова. Усё з той жа ўсеабдымнай усмешкай штосьці абавязкова “шаптала на вушка”: камплімент, заўвагу, параду. І тыя ніколі не былі дзяжурнымі — заўсёды трапнымі, шчырымі, падгледжанымі пільным вокам. У самім яе абліччы пульсавала тая шчырасць, што бывае ўласціва хіба дзецям. Невыпадкова яна даволі часта спявала ў тэатры дзяўчынак-падлеткаў. Таму спрыяў і срэбрана-званочкавы голас — каларатурнае сапрана, і больш чым сціплы рост. Дый сам характар! Так, былі ў яе рэпертуары і партыі першых “прымадоністых” прыгажуняў, і мяккіх лірычных гераіняў (яна ж пераспявала ўвесь класічны рэпертуар нашага тэатра!), і гуллівых какетак-гарэзаў з класічных аперэт. Але асабіста для мяне яна засталася найперш Марфачкай і Марынкай — гераінямі беларускіх опер “Дзяўчына з Палесся” Яўгена Цікоцкага і “Марынка” Рыгора Пукста. Не, я не заспела гэтыя спектаклі на сцэне, але яе фота з іх, дзе Ніжнікава з банцікамі ды смешнымі касічкамі, — гэта тое яе аблічча, якое я бачыла ў ёй і тады, калі яна перасягнула сваё 90-годдзе.

А ў мяне яна асацыявалася са святам 8-га сакавіка. Не толькі з-за таго, што дзень яе народзінаў прыпадаў на дзень пазней — 9-га, а яшчэ і таму, што яна была папраўдзе “жанчына-свята”. І гэта пры тым, што жыццё ў яе было зусім не салодкім: бацьку страціла ў дзяцінстве, юнацтва прыпала на ваенныя гады, працавала санітаркай у ваенным шпіталі, прыехаўшы вучыцца ў Маскоўскую кансерваторыю, першы час начавала на вакзале, дый у Мінску, куды патрапіла пасля вайны, шмат было складанасцей і жыццёвых трагедый. Але яна заўжды выпраменьвала жаноцкасць, “фірменную” ўсмешку, святочнасць самога свайго з’яўлення, хаця ў душы, як можна сабе ўявіць, было не заўсёды сонечна. Ды што з таго! Яна была чараўніцай, якой падуладна стварэнне “надвор’я” — у высокім і адначасова вельмі дэмакратычным храме вакалу.

Надышоў час, калі яе анёльскія спевы (а яна захавала свежасць свайго голасу — не толькі праз добрую вакальную школу, якую перадавала сваім вучням, але і праз малады бляск у вачах), яе матчына апека спатрэбіліся на нябёсах. Ніжнікава канчаткова стала “Верхнікавай”, як яе калісьці называлі з-за высокіх нот. І будзе дапамагаць нам і нашай вакальнай школе ўсё ў тым жа статусе зоркі — толькі цяпер папраўдзе незямной.

Гістарычная памяць не існуе сама па сабе. Гэта — заўжды плён чыёйсьці работы. Пэўнага кшталту сацыяльная інжынерыя, здатная ствараць новыя "тэксты" і падтрымліваць тыя, на якіх будуецца наша сённяшняя візія гісторыі. У тым ліку, і самых балючых яе эпізодаў.
Памяць пра падзеі Другой сусветнай вайны сёння ўшаноўваецца не толькі праз стварэнне вялікіх мемарыялаў, але і куды больш камерным спосабам. Невялічкае "зярнятка" брукаванкі з металічнай шыльдачкай, на якой напісанае імя канкрэтнага чалавека, усталёўваецца ў ходніку каля таго месца, дзе ён калісьці жыў — пакуль не прыйшла вайна. Праходзячы міма, ты міжволі заўважаеш гэтую дэталь — і, магчыма, спынішся ды задумаешся.
Першыя на Беларусі "Камяні спатыкнення" неўзабаве маюць быць усталяваныя ў Гродне — з яго пакручастай і поўнай трагедый гісторыяй, сумныя напаміны пра якую і дасюль літаральна пераследуюць сучаснікаў. Заканамерна, што менавіта ў гэтым горадзе апрабуюцца цікавыя практыкі актуалізацыі гістарычнай свядомасці.

Мемарыял на месцы знаходжання Шталага № 324 у раёне Фолюш (г. Гродна).

"Камяні спатыкнення" ў віхуры часу

Генадзь ВОХІН / Фота аўтара

Барыс Кваткоўскі.

"Камяні спатыкнення", падрыхтаваныя для ўсталявання ў Гродне.

НАЙПЕРШ — ТЫЯ, ХТО ВЫЖЫЎ

Праект нямецкага мастака Гунтэра Дэмніга "Камяні спатыкнення", прысвечаны памяці ахвяр нацыянал-сацыялізму, быў задуманы ў сярэдзіне 1990-х і неўзабаве атрымаў распаўсюд па ўсёй Еўропе. Сёння такіх камянёў па ўсім свеце ўжо больш за 50 тысяч.

— Яны ўсталяваныя ў Расіі, Украіне, нават, здаецца, у далёкай Аргенціне, але ў Беларусі, на жаль, дагэтуль ніводнага не з'явілася, — кажа грамадскі дзеяч Яўген Калодзін, які выступіў адным з ініцыятараў з'яўлення такіх камянёў у Гродне.

За два дзесяцігоддзі "Камяні спатыкнення" атрымалі не толькі вялікую папулярнасць, але і спарадзілі некалькі іншых падобных праектаў. Адзін з іх — "Астатні адрас" у Расіі, прысвечаны памяці ахвяр палітычных рэпрэсій.

У Беларусі першая спроба далучыцца да міжнароднага руху ўшанавання пацярпелых ад нацызму была зробленая трохі больш за год таму. Як расказаў старшыня рады гродзенскай іўдзейскай рэлігійнай грамады Барыс Кваткоўскі, усё пачалося менавіта з увекавечвання памяці ахвяр Халакосту:

— Дзякуючы міжнародным сувязям мы былі ўключаны ў шэраг мемарыяльных праектаў. Адзін з іх акурат і прысвечаны "Камяням спатыкнення".

Звычайна на "Камянях спатыкнення" выгравіраваныя прозвішчы тых, хто жыў некалі на гэтай вуліцы і стаў ахвярай нацыстаў. Але ў Гродне было вырашана пачаць з ушанавання тых, хто змагаўся і перамог. Першыя два камяні, вырабленыя для ўсталявання, прысвечаны памяці, у прыватнасці, тых, хто цудам выжыў у ліхалецці. І ў гэтым — асаблівасць айчыннага мемарыяльнага праекта.

На першых двух камянях — яўрэйскія прозвішчы. Але, як падкрэслівае спадар Кваткоўскі, праект зусім не абмежаваны ўшанаваннем памяці ахвяр Халакосту:

— Натуральна, мы абралі для сябе тое, што непасрэдна блізка нам — трагедыю нашага народа, калі яўрэяў забівалі толькі за тое, што яны былі яўрэямі. Але ж сама ідэя "Камянёў спатыкнення" не мае ніякіх этнічных рамак, і мы гатовыя супрацоўнічаць з самым шырокім колам партнёраў.

СТРАШНЫЯ ЗНАХОДКІ ФОЛЮША

І сапраўды, ахвяры нацызму ў Гродне — гэта не толькі 29 тысяч яўрэяў горада. Другая па колькасці група — савецкія ваеннапалонныя. Паўз заснежаную пустку дабіраюся да аднаго з самых жахлівых у гісторыі горада месцаў.

Фолюш — гэта колішняе прадмесце Гродна, а ў нашы дні — яго спальны раён. Сёння цяжка паверыць, што некалі ў тым зацішным кутку знаходзіўся лагер смерці для ваеннапалонных, дзе ўсяго за год з лішкам загінула болей за 25 тысяч чалавек.

Апрача "Шталагу № 324", у горадзе быў і перасыльны лагер "Дулаг № 25", які месціўся каля станцыі Ласосна. Там праходзіла "сартаванне" ваеннапалонных — дужых і здаровых высылалі на прымусовыя работы ў Еўропу, а аслабленых і хворых — у Фолюш на загубу.

Гэтыя мясціны па-ранейшаму прытойваюць страшныя знаходкі. Дзесяць гадоў таму пры правядзенні работ у 200 метрах ад "Шталагу" былі выяўленыя невядомыя раней пахаванні савецкіх салдат. Парэшткі перанеслі на могілкі "Аўльс". І на гэтым знаходкі не скончыліся.

— Літаральна цягам астатніх некалькіх гадоў былі знойдзены парэшткі больш чым 1600 вайскоўцаў, якія ўрачыста перапахавалі там жа, на тэрыторыі фолюшскага "Шталагу", — дадае галоўны спецыяліст аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага гарвыканкама Наталля Каротчыкава. — Работа па ўвекавечванні памяці ахвяр вайны ў нас у горадзе не спыняецца.

Распачатая яна была яшчэ за савецкімі часамі. Вайсковыя пахаванні траплялі ў ахоўныя спісы, несупынна даглядаліся, на іх усталёўваліся велічныя манументы. Праўда, такая ўвага надавалася перадусім месцам спачыну савецкіх воінаў часоў Другой сусветнай вайны. Вайсковыя ж пахаванні Першай сусветнай альбо польскія міжваенныя часта не толькі забываліся, але маглі быць наогул спляжаныя.

Як адзначыла Наталля Каротчыкава, у незалежнай Беларусі практыкі работы з памяццю істотна змяніліся:

— Цяпер і "польскія" магілы мы даглядаем на афіцыйным узроўні, — тлумачыць яна. — Згодна з Указам Прэзідэнта № 109 за 2016 год "Аб увекавечванні памяці пра загінулых пры абароне Бацькаўшчыны і захаванні памяці пра ахвяр вайны", усе міжваенныя пахаванні 1919 — 1939 гадоў таксама ўключаны ў агульнарэспубліканскі ахоўны спіс і пашпартызаваныя.

Болей за тое — нават магілы нямецкіх акупантаў таксама не адданыя забыццю. Як расказала Наталля Каротчыкава, у 2015 годзе ў гарвыканкам звярнуліся прадстаўнікі германскага фонду па даглядзе пахаванняў на тэрыторыі Беларусі:

— Паводле сведчанняў дакументаў вермахта, на тэрыторыі горада на рагу вуліц Лідскай і Белуша знаходзілася адно з такіх пахаванняў. Па выніках перамоў было прынятае рашэнне аб даследаванні дадзенага раёна і аб пераносе парэштак каля 90 салдат на нямецкія вайсковыя могілкі ў Беразіно.

Як запэўніла галоўны спецыяліст, мясцовыя ўлады заўжды ахвотна ідуць на супрацоўніцтва з міжнароднымі арганізацыямі і гатовыя падтрымаць любую карысную ініцыятыву. Праца працягваецца і ў іншым кірунку. Усё болей замардаваных у "Шталагу" савецкіх воінаў можна назваць пайменна — дзякуючы праведзеным даследаванням.

— Да нас рэгулярна звяртаюцца сваякі тых, каго ўдалося апазнаць, — кажа яна. — Але работы яшчэ вельмі многа, і не ўпэўненая, што калісьці яе наогул атрымаецца завяршыць. На жаль, з 25 641 пахаваных на тэрыторыі лагера асобаў сёння вядомыя імёны толькі 3 927.

Але нават апошняя лічба сведчыць пра тое, як шмат "Камянёў спатыкнення" можа з'явіцца на нашых вуліцах.

ЧАС ЯШЧЭ ПРЫЙДЗЕ

Гатовыя да ўсталявання два камяні сёння праходзяць працэдуру ўзгаднення з боку мясцовых улад. А пакуль ідзе гэты юрыдычны працэс, рыхтуюцца яшчэ пяць такіх камерных мемарыяльных аб'ектаў. У той самы час, узнікае пытанне — ці атрымае гэтая практыка далейшае распаўсюджванне па ўсёй Беларусі?

Меркаванні на гэты конт даводзілася чуць розныя. Пры ўсёй эфектыўнасці задумы, яна мае і слабыя бакі — асабліва ў нашым клімаце. Сапраўды, надвор'е можа стаць сур'ёзнай перашкодай: пад снежным покрывам камянёў проста не будзе відаць. У сваю чаргу, некаторыя з засцярогай ставяцца да таго, што мемарыяльны аб'ект з імёнамі загінулых апынецца літаральна пад нагамі ў мінакоў. Хаця калі назіраць за іх паводзінамі ў замежных гарадах, можна пераканацца, што людзі звычайна стараюцца на тыя камяні не наступаць.

Урэшце, ёсць і яшчэ адна праблема. Для таго, каб праект дасягнуў пастаўленай мэты — ці хаця б нават проста быў "заўважаны" — камянёў павінна быць шмат. А гэта патрабуе выдаткаў — можа, не такіх, як іншыя сродкі мемарыялізацыі, але ўсё адно вельмі значных.

Паколькі праект міжнародны і міжнацыянальны, цікавасць да яго ўжо праявілі і беларускія грамадскія аб'яднанні. Але ж іх рэсурсы таксама абмежаваныя. Таму пытанне фінансавання пакуль адкрытае. Як, зрэшты, і многія іншыя.

— Праекту трэба даспець — прыйдзе яшчэ час! — адзначыў спадар Кваткоўскі. — Дый гэта ж яшчэ нават не праект! Праект для мяне — калі ёсць дакладны план дзеянняў, спіс удзельнікаў, тэрміны выканання... Пакуль што ёсць толькі ідэя, але ж якая яна прыгожая і годная!

К

На маю думку

Чаму я пайду на выбары

Канстанцін КАРНЯЛЮК,
педагог, Віцебск:

18 лютага адбудуцца выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў 28-га склікання. Пераважная большасць грамадзян Беларусі плануе прыняць актыўны ўдзел у працэсе абрання мясцовых дэпутатаў — тых суайчыннікаў, якія будуць не на словах, а канкрэтнымі справамі змагацца за паляпшэнне нашага матэрыяльнага і духоўнага жыцця.

У гэты важны гістарычны перыяд ніхто з нас не можа заставацца абыякавым. Я проста не разумею тых песімістаў, якія пастаянна енчаць: нічога не зменіцца, можна і не хадзіць на выбары. Гэта неразумная, апатычная пазіцыя — маўляў, мая хата з краю. Нельга быць манкуртам, чалавекам перакаці-поле — бо так бур'ян ды чартапалох могуць і ў мазгах прарасці.

Упэўнены, што менавіта дэпутат з вёскі, мястэчка, горада здольны вырашаць нашы паўсядзённыя жыццёвыя праблемы: парупіцца пра рамонт асфальтавага пакрыцця, упрыгожванне вуліцы або сквера, паляпшэнне ўмоў аб'ектаў сацыяльнага і культурнага прызначэння. А пачынаючы з малой радзімы, так і ўвесь партрэт Бацькаўшчыны палепшыцца.

У дэпутата-парламентарыя задачы, усё ж, больш глабальныя. А вось мясцовы дэпутат — гэта практык, які павінен вырашаць пытанні хай і не надта рэзананасныя, але, тым не менш, вельмі важныя для простых людзей. Сапраўдны абранец проста жыве клопатамі свайго мікрараёна, вуліцы, вёскі. І людзей не можа не хваляваць, на якім якасным узроўні будуць вырашацца іх шматлікія праблемы — эканамічныя, бытавыя, гаспадарчыя.

Таму я проста ўпэўнены, што на сёлетніх выбарах яўка будзе добрая. А тым, хто яшчэ стаіць на ростанях, параіў бы актывізавацца. Нам патрэбны моцныя Саветы дэпутатаў з альтэрнатыўнымі поглядамі, свежымі думкамі і меркаваннямі. Не павінна быць аднабокіх рашэнняў. Праблемы на месцах трэба вырашаць комплексна, абавязкова пытаючыся ў народа, што і дзе будаваць, адчыняць і гэтак далей.

Вельмі важна, каб у грамадстве былі цывілізаваныя дыскусіі, абмеркаванні. Нам усім разам трэба вучыцца знаходзіць кропкі судакранання, уздымаць нашу палітычную культуру. А то некаторыя толькі непрыстойныя анекдоты ў курылках здольныя распавядаць або крытыкаваць без меры.

Менавіта народ на месцах лепш за ўсё бачыць і можа ахарактарызаваць сацыяльны партрэт дэпутата. З другога боку, нельга выйсці з гушчы народа — і быць адарваным ад яго.

Ідучы на выбары, варта вывучыць праграмы кандыдатаў, каб зразумець, што яны могуць зрабіць для эканомікі, адукацыі, медыцыны рэгіёна. Клопаты людзей дэпутат не проста павінен разумець, але і трымаць руку на пульсе часу. Трэба карыстацца аўтарытэтам сярод тых, хто жыве побач. Ведаць, у якім доме пагасла святло, а каму патрэбна паляпшэнне жыллёвых умоў.

Нельга не падкрэсліць, што мясцовыя дэпутаты не атрымліваюць заробак, гэта іх грамадская нагрузка. Хаця ўсё яшчэ даводзіцца чуць: маўляў, жывуць на грошы народа! Нельга ставіцца негатыўна да народных абраннікаў. І вельмі дрэнна, калі чалавек нават не ведае, як завуць яго дэпутата, хаця фармальна ў выбарах і браў удзел.

Думаецца, трэба павышаць і сам статус, прэстыж Саветаў мясцовых дэпутатаў. Людзі не павінны на сваёй радзіме хадзіць па лабірынтах улады, дзе адно акно, але ажно сем дзвярэй. Чалавек з рэгіёна не мусіць звяртацца са скаргай у абласны горад ці Мінск, бо на месцах яму ніхто не можа ці не хоча дапамагчы.

Радуе, што, нягледзячы на цяжкасці, эканоміка Беларусі набірае тэмп, ідзе ў рост. Але многае тут залежыць і ад кожнага з нас. Мы ўсе разам павінны працаваць дзеля далейшага росквіту Бацькаўшчыны.

Часта ўзгадваюцца словы Марка Тулія Цыцэрона: "Выбірай, каго будзеш любіць". Так, ад кожнага з нас залежыць, які напрамак далейшага руху мы будзем выбіраць.

Элегантна, лаканічна, тонка…

Ксенія ДУБОЎСКАЯ,
кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў:

На каго цяпер арыентуюцца айчынныя сцэнографы? У першую чаргу — на мастакоў тэатра лялек. Моду дыктуе візуалацэнтрызм, і на сённяшні момант у плане візуальнага вырашэння айчынны тэатр лялек наперадзе ўсіх.

Чаму ён атрымаў агульнаеўрапейскае прызнанне? Па-першае, акцёрскае існаванне ў тэатры лялек першапачаткова адрозніваецца ад існавання ў драматычным тэатры. За больш зразумелым тлумачэннем занурымся ў гісторыю. Першая школа акцёрскага майстэрства ўзнікла ў эпоху класіцызму. На той час гэта быў сапраўдны прарыў у развіцці тэатральнага мастацтва. Аднак наступныя некалькі стагоддзяў творцы змагаліся з наслаеннямі класіцызму: яны хацелі дабіцца большай праўдападобнасці. Тэатр прагнуў натуральнасці сцэнічнага дзеяння. Мо прыводжу грубае параўнанне, але, па маім адчуванні, цяпер адбываюцца падобныя працэсы з сістэмай псіхалагічнага тэатра. Так, з'яўленне асноў псіхалагізму ў акцёрскай гульні сталася велічэзным прарывам, сур'ёзным падмуркам, і ўсё ж, баюся, мы яшчэ шмат часу будзем выдаткоўваць, каб пераадолець залішнія наслаенні гэтага ўнёску. Досвед захаваць трэба, але неабходна браць новыя цагліны і будаваць тэатральную прастору далей. Сучасны тэатр прыйшоў да высновы, што чым менш ігры, тым лепш. Сёння глядач чакае ад выканаўцы размовы на роўных.

І гэта можа прапанаваць тэатр лялек, які першапачаткова ўзводзіўся крыху на іншым падмурку. Мастакі тэатра лялек назапасілі агромністы арсенал візуальных сродкаў, які патроху запазычваюць іншыя тэатральныя кірункі. Невыпадкова мы ўсё часцей карыстаемся тэрмінам "тэатр аб'екта": дзеянне, у якім можа выкарыстоўвацца нават не ўласна лялька, а шматшмат розных аб'ектаў. І мастакі тэатра лялек добра ведаюць, як з усім гэтым працаваць. Сцэнографам драматычных тэатраў многія з гэтых прыёмаў першапачаткова неўласцівыя. У беларускім рэчышчы можна назваць нямала выключэнняў: заварожваюць работы Алены Ігрушы ў Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі і не толькі, уражваюць пастаноўкі Андрэя Жыгура ў Тэатры імя Якуба Коласа (а яшчэ — ён мастак цікавага site-specific праекта Anti[gone], што ладзіцца ў сталічным музеі-майстэрні Заіра Азгура і нашумелага спектакля "Опіум"), натхняюць Юлія Карымава, Валянціна Праўдзіна, Таццяна Дзівакова. Аднак многія іншыя мастакі драмы, на жаль, спыніліся на адлюстраванні месца дзеяння. Так, там прысутнічае метафара, часта нядрэнная, але…

Беларусь займела цэлую плеяду гучных імён мастакоў тэатра лялек! Таццяна Нерсісян і Людміла Скітовіч маюць свой адметны почырк і сумесна з рэжысёрскай ідэяй чыняць нешта неверагоднае. Аляксандр Вахрамееў неаднойчы зачароўваў сваімі рашэннямі: з ходу назаву "Чайку" ў пастаноўцы Аляксея Ляляўскага і "Гамлета" ў рэжысуры Ігара Казакова. З новага пакалення цікава было назіраць за пошукамі Вольгі Шчарбінскай: яна рабіла сцэнаграфію да спектакля "Гедла Габлер" рэжысёра Наталлі Слашчовай у Гомельскім дзяржаўным тэатры лялек.

За што яшчэ можна сказаць тэатру лялек "дзякуй", дык гэта за развянчанне памылковай думкі, нібы сцэнаграфія да дзіцячага рэпертуару абавязкова павінна ззяць усімі колерамі вясёлкі. Некаторыя тэатры невядома чаму ўпэўнены, што пастаноўка для маленькіх павінна нагадваць канфеці. У фарбах калі і адступяцца ад кіслотных колераў, дык не шкадуюць самых сакавітых: спалучэнне сіняга і жоўтага, аранжавы і — абавязкова — чырвоны. Чамусьці яны забываюцца на тонкасць візуальнага рашэння. Лепшыя мастакі тэатра лялек прапануюць іншыя правілы: яны ствараюць для малечы гісторыі ў стыльным, акуратным атачэнні. Элегантна, лаканічна, тонка, без клоўнскіх замашак — вось арыенціры сцэнографа, які разумее, што дзіця — гэта таксама чалавек.

Занатавала
Настасся ПАНКРАТАВА

Дзяжурны па нумары

За партнёрку — навука

Гэтым тыднем у Нясвіжы і Мінску адбылася Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Беларускі балет у сусветнай культурнай прасторы". Так здарылася, што прадстаўленыя на ёй даклады не столькі адказалі на актуальныя пытанні сучаснага харэаграфічнага мастацтва, колькі задалі іх.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Нічога падобнага ў нас дагэтуль не праводзілася — тым больш, на міжнародным узроўні, з дакладчыкамі з Латвіі, Літвы, Польшчы, Расіі, Францыі, з майстар-класам літоўскіх педагогаў, цікавай канцэртнай праграмай кафедры опернай падрыхтоўкі і харэаграфіі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Трэба бясконца дзякаваць усім, хто спрычыніўся да арганізацыі і правядзення форуму: двум міністэрствам — замежных спраў і культуры, Пасольству Беларусі ў Францыі, нашай Акадэміі музыкі, Нацыянальнаму гісторыка-культурнаму музею-запаведніку "Нясвіж", які гасцінна прымаў удзельнікаў і слухачоў канферэнцыі ў першы дзень яе правядзення, Нацыянальнай камісіі Беларусі па справах UNESCO, некалькім спонсарам. Але пытанні засталіся.

Першае з іх — уласна харэаграфічная тэрміналогія і, шырэй, сама тэорыя гэтага мастацтва. З гісторыяй, як ні дзіва, усё крыху прасцей. Нягледзячы на складанасць захавання балетнай спадчыны, асабліва мінулых часоў, калі не было відэазапісаў (дый любыя запісы, вядома, недасканалыя, бо фіксуюць хіба знешнія параметры і не могуць перадаць усяго, што ўкладаў пастаноўшчык у той ці іншы рух). Навуковыя даследаванні, прысвечаныя гэтай галіне, існуюць. Што ж тычыцца тэорыі, дык тут сапраўды — поле неаранае.

З балетнай класікай усё не так драматычна. Там распрацаваны і пазіцыі ног ды рук, і назвы асобных поз, рухаў, піруэтаў, падтрымак, і жанравая палітра як саміх спектакляў, так і асобных нумароў, і некаторыя асновы формаўтварэння. А што ж з сучаснымі кірункамі? Там пакуль усё яшчэ толькі пачынаецца.

Тэорыя крочыць следам за практыкай. А ў нас сучасны танец пачаў развівацца не так даўно. Але глабальных фундаментальных даследаванняў няма, наколькі мне вядома, і ў замежжы. Ёсць звязаныя з фізіялогіяй, псіхалогіяй танца, распрацоўваюцца жанравыя асаблівасці народных і народна-сцэнічных танцаў, бальных, бальна-спартыўных, стылёвыя рысы эстрадных.

Сучасная ж акадэмічная харэаграфія застаецца пакуль без глыбокага і шырокага тэарэтычнага падмурку. Узнікаюць асобныя яе апісані, эстэтычна-філасофскія абгрунтаванні. Ёсць тэндэнцыя з'яўлення ў свеце ўсё новых, даволі шматлікіх аўтарскіх школ і кірункаў. Сама па сабе такая размаітасць — справа добрая. Але ў мастацтве ніводная рэч сама па сабе не існуе. Кожная мае сваё "генеалагічнае дрэва": карані, камель, рознабаковыя адгалінаванні. У музыцы такая паслядоўнасць, дзе тэорыя мяжуе з гісторыяй і яны падтрымліваюць, падсілкоўваюць адзін аднаго, даўно распрацавана і працягвае плённа развівацца. У харэаграфіі — яшчэ не. Мо, таму і ўзнікаюць нажніцы ў ацэнцы многіх сучасных з'яў і адноўленай класікі, у тым ліку на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі?

У нашай Акадэміі музыкі вядзецца падрыхтоўка балетазнаўцаў, але апошнім часам ніхто з абітурыентаў, маючы харэаграфічную падрыхтоўку, туды не імкнуўся. Абіралі найперш спецыяльнасць педагога-рэпецітара, зрэдку — харэографа-пастаноўшчыка. Можа, яшчэ і таму, што балетная крытыка ў нас не надта вітаецца?

У некаторых дакладах канферэнцыі гучала музыказнаўчая тэрміналогія, перанесеная на харэаграфію. У музыказнаўстве, у сваю чаргу, выкарыстоўваецца шмат з таго, што ў свой час было распрацавана ў літаратуразнаўстве, філасофіі, мастацтвазнаўстве. Такія скрыжаванні застаюцца актуальнымі, бо падштурхоўваюць даследчыкаў да далейшых назіранняў і пошукаў — з новага пункту гледжання.

Што ні кажыце, а час тэарэтыкаў харэаграфіі (знаёмых, вядома, з яе практыкай) — наспеў. Беларусь мае грунтоўную базу — тую ж Акадэмію музыкі, якую ўзначальвае доктар мастацтвазнаўства, прафесар Кацярына Дулава, дысертацыя якой была прысвечана менавіта балетнаму жанру як музычнаму феномену. Патрэбны далейшыя намаганні Акадэміі, універсітэта культуры і мастацтваў, адпаведных кафедраў (узгадаем мары Валянціна Елізар'ева пра айчынную Акадэмію харэаграфіі) у стварэнні тэарэтычнага падмурку і падрыхтоўцы спецыялістаў-балетазнаўцаў. Беларусь у стане зрабіць свой унёсак у вырашэнне гэтай праблемы, актуальнай для нацыянальнага і сусветнага мастацтва.

К

“Я сам сабе канкурэнт!”

Маэстра Фінберг — пра малую радзіму, “бітлоў” і прафесіяналізм

Нязменны кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага аркестра эстраднай і сімфанічнай музыкі, народны артыст Беларусі, прафесар Міхаіл ФІНБЕРГ быў названы Чалавекам года культуры ў сваёй намінацыі “Музычнае мастацтва”. Наўрад ці хтосьці палічыў такое рашэнне незаслужаным — з увагі на зробленае ім летась. Між тым, і гэты год у жыцці калектыву абяцае быць не менш насычаным на падзеі. Як падаецца, яго дзейнасць надзвычай трапна адлюстроўвае ідэю Года малой радзімы — і асабліва гэта тычыцца фестываляў у невялікіх гарадах, чый агульны лік перавысіў ужо 500.

Ілья СВІРЫН

— Думаецца, поўны спіс вашых рэгалій не змясціўся б на гэтай газетнай паласе. Наколькі важна для музыканта атрымліваць такія знакі пашаны? Ці ўплываюць яны непасрэдна на творчасць?

— Узнагароды для мяне — гэта найперш новая адказнасць. Ты павінен быць адказным за тое, што табе дала Радзіма. У гэтым і праяўляецца сапраўдны, а не штучны патрыятызм. Прыкладам, калі цябе абвясцілі ганаровым грамадзянінам таго ці іншага горада або рэгіёна, ты проста абавязаны нешта зрабіць для таго краю. Я з’яўляюся ганаровым грамадзянінам Мінскай і Гомельскай абласцей, а таксама цэлага шэрагу вялікіх і малых гарадоў. І гэта значыць, што я абавязаны кожнаму з іх! Са скуры буду вылузвацца, каб апраўдаць той давер — зразумела, праз нашу творчасць, праз тыя праграмы, якія мы прапануем публіцы.

Узнагароды — гэта прыемнае (асабліва калі ты сам разумееш, што заслужыў іх па праве), але зусім не галоўнае. Яны ніяк не ўплываюць на сутнасныя рэчы: на тое, як я стаўлюся да мастацтва, на мае прыярытэты, якія застаюцца нязменнымі праз усё жыццё. Мы заўсёды ставілі і ставім перад сабой мэту прапагандаваць найлепшыя ўзоры нацыянальнай культуры, а разам з імі — і любоў да Радзімы. Гэта толькі здаецца, што такі шлях лёгкі: маўляў, раз — і ў дамках!

— Вы казалі пра адказнасць. А перад кім непасрэдна?

— Безумоўна, найперш перад слухачамі. Перад тымі простымі людзьмі, якія прыходзяць на нашы канцэрты. А мы — і я гэтым ганаруся! — выступаем перад самай рознай аўдыторыяй. Прыкладам, вось ужо 31 год запар аркестр прыязджае на Мазырскі нафтаперапрацоўчы камбінат. І абавязкова паедзем зноў, нягледзячы на вельмі шчыльны гастрольны графік. Бо нас там чакаюць.

— Выраз “малая радзіма” выклікае ў кожнага свае асацыяцыі. А які краявід паўстае ў вас перад вачыма, калі вы чуеце гэтыя словы?

— Вёска Мялешкавічы ў Мазырскім раёне, адкуль паходзяць мае бацькі. Для мяне гэта родныя мясціны. Аднойчы па дарозе на фестываль у Тураў завітаў туды. Выйшаў з машыны — і моўчкі прастаяў некалькі хвілін, ледзь стрымліваючы слёзы. У маёй свядомасці ўсплывала ўсё тое, што давялося там перажыць у пару дзяцінства.

Мялешкаўцы — людзі працавітыя, рукастыя, сапраўдныя майстры кожнай справы. Жылі мы тады вельмі бедна — бульбачка, гурок які... Іншага нічога і не каштавалі. На працу шмат каму даводзілася ў Мазыр выбірацца — а гэта 25 кіламетраў будзе. Але пры гэтым вяскоўцы ўсё рабілі прыгожа і ад душы. А як яны ўмелі адчуваць хараство свайго краю і сваёй роднай мовы! Менавіта з тых часоў і пайшла мая любоў да іх, якая — на ўсё жыццё.

А якое было сяброўства, салідарнасць! Калі наша сям’я пераехала ў Мазыр, трэба было наноў уладкоўваць гаспадарку. І вось, у выхадныя былыя аднавяскоўцы выпраўляліся ў горад на рынак, а потым наведваліся ў нашу хату, каб дапамагчы нам пасадзіць бульбу або зрабіць што іншае. Гэтыя простыя і шчырыя людзі — назаўсёды ў маім сэрцы.

— Але ў вашай біяграфічнай даведцы напісана, што вы нарадзіліся ў Мазыры...

— Гэта так. Бацькі перабраліся туды незадоўга да майго нараджэння. Я жыў на горцы, у доме па адрасе Пушкіна, 8. Хадзіў у звычайную школу, потым у музычную. Усе гэтыя мясціны дзяцінства для мяне — самыя важныя. Гэта частка майго жыцця.

— А калі вам даводзілася найбольш сумаваць па родным доме?

— У 1962-м я 15-гадовым хлапчуком сеў у цягнік ды выправіўся ў Курск, дзе стаў выхаванцам ваеннага аркестра. Там і азы музыкі добра засвоіў, але і муштравалі нас як след: войска ёсць войска. Ніколі не забуду той выпадак, калі аднойчы быў прызначаны сігналістам, а машына некуды не туды збочыла, і пра мяне “забыліся”. Я застаўся на сваім посце адзін — цемра, мароз... Незабыўныя ўражанні! Прыязджаючы ў Мазыр на адпачынак, ледзь не цалаваў сваю падушку ў родным доме! Але тыя ўрокі былі карыснымі. У жыцці мне яны потым вельмі прыдаліся.

— Год пачаўся для вашага калектыву як звычайна: фэст у Заслаўі, “Мінскі джаз”, потым будзе “Шлягер на ўсе часы”. А ці плануеце вы нешта... нечаканае?

— Не-не, нічога нечаканага не будзе — толькі чаканае! Усе нашы канцэрты дбайна рыхтуюцца і прадумваюцца літаральна да драбніцаў, і менавіта ў гэтым сакрэт іх поспеху. Той жа джазавы фестываль ізноў, як і кожны год, праходзіць з аншлагам — хаця прадаць білеты ў цяперашні час не так і проста. А сваю гастрольную дзейнасць мы плануем ужо на 2019 год.

— Але пры такой арганізаванасці ці ёсць у вас магчымасць атрымаць новыя ўражанні? Бо якая ж творчасць без іх?

— Безумоўна! Я пастаянна адкрываю для сябе нешта новае. Летась вось упершыню зладзілі свой фестываль у Вілейцы, і калі мы давалі канцэрт у прыгажэзным касцёле, сэрца ажно трымцела! Будучы чалавекам, не надта абазнаным у рэлігіі, я адкрыў для сябе новую глыбіню, новы духоўны пласт. І адчуваў у гэтыя моманты тое, што адчувалі і ўсе слухачы. Сёлета зробім фестываль на Мядзельшчыне, адзін з канцэртаў якога пройдзе ў цудоўным Будслаўскім касцёле, які з’яўляецца сапраўдным упрыгожваннем нашай Бацькаўшчыны.

— Звычайна канцэрт складаецца з абоймы песень. А ваш аркестр рэгулярна прэзентуе творы ў “буйным жанры” — канцэптуальныя праграмы, прысвечаныя той ці іншай постаці. Здаецца, у вашым багажы іх лік ужо ідзе на дзясяткі...

— Калі не на сотні. Толькі праграм на творы нашых несмяротных класікаў паэзіі намі было зроблена ўжо 38! Так, фармат гэты даволі складаны — выканаць пэўную колькасць песень куды прасцей. Тут жа патрэбная драматургія, якая павінна знітоўваць літаральна кожны элемент дзеі. Ды і дапасаваць вершаваныя радкі да музыкі — так, каб яны ўтварылі непарыўнае цэлае — не заўсёды бывае проста.

Фота Сяргея ЖДАНОВІЧА

> **Вёска Мялешкавічы ў Мазырскім раёне, адкуль паходзяць мае бацькі, для мяне гэта родныя мясціны. Аднойчы па дарозе на фестываль у Тураў завітаў туды. Выйшаў з машыны — і моўчкі прастаяў некалькі хвілін, ледзь стрымліваючы слёзы. У маёй свядомасці ўсплывала ўсё тое, што давялося там перажыць у пару дзяцінства.**

— А ці не адчуваеце вы своеасаблівую “вычарпанасць жанру”?

— Ні ў якім разе. Летась мы зрабілі новую праграму, прысвечаную Купалу і Коласу. І падчас яе падрыхтоўкі я пераканаўся: кожнага разу беручы ў рукі іх кнігі (а беларускую класіку я чытаю шмат і вельмі ўважліва!), ты адкрываеш для сябе нешта новае. А адкрыўшы, можаш перадаць гэтыя свае ўражанні і слухачам. Перакананы, што і да словаў Багдановіча і Куляшова нам трэба звярнуцца яшчэ раз — не ўсё тут яшчэ выказана. А напагатове і праграма, прысвечаная Караткевічу.

Таксама рыхтуем праграму ў гонар легендарнага Ігара Лучанка, якому ў жніўні спаўняецца 80 гадоў. Для мяне яна вельмі адказная — улічваючы хаця б маштаб асобы і яе ролю ў беларускай музыцы. І рады, што на рэпетыцыйнай пляцоўцы мы атрымліваем ад сваёй працы сапраўднае творчае захапленне. Асабліва мяне ўзрушвае той імпэт, чуласць, з якой на творы Лучанка адгукаюцца маладыя ўдзельнікі калектыву.

— У той самы час, зусім хутка вы прапануеце публіцы і аркестравае пераасэнсаванне песень “Бітлз”.

— Праграма прысвечана 75-годдзю Пола Макартні — я спецыяльна вылучыў яго на афішы. Гэта музыка, якая жыве і будзе жыць.

— Але вы заспелі тую эпоху, калі яна лічылася “класава варожай”.

— Сапраўды, было і такое, аднак час расставіў усё на свае месцы. Мы ж тады нічога асабліва пра “бітлоў” не ведалі, адкуль нам было ведаць? Там адну песню пачуў, там іншую... Адразу мне далёка не ўсё спадабалася з іх твораў, але з гадамі моцна іх палюбіў і асэнсоўваў усё глыбей і глыбей. Пагатоў, у нас у аркестры ёсць сапраўдныя бітламаны — той жа Уладзімір Ткачэнка, чый спектакль “Сімфонія “Бітлз” мы некалі ўвасобілі на сцэне.

— Дзіўная разнапланавасць.

— Ды нічога дзіўнага! Усё, што мы робім, аб’ядноўвае найперш адно — прафесіяналізм. А стоячы на гэтым трывалым грунце, можна эксперыментаваць як заўгодна. Чаму ў нас сімфанічнай музыкай займаюцца выключна прафесіяналы? Яны і ствараюць яе, і выконваюць, і дырыжыруюць — і ў спалучэнні атрымліваецца належны вынік. А вось на эстрадзе гэтае правіла нешта не працуе.

— Але хіба тых жа “бітлоў” можна назваць прафесіяналамі — прынамсі, у звыклым сэнсе слова?

— Так, яны не атрымалі музычнай адукацыі — але пры гэтым пастаянна вучыліся. Прычым многае запазычвалі і ў класічных кампазітараў, не кажучы ўжо пра эстраднікаў. І таму іх музыка крок за крокам станавілася ўсё больш дасканалай і асэнсаванай, несупынна рушыла ў бок прафесіяналізму. А не ў адваротным кірунку — ад прафесіяналізму да самадзейнасці.

— А цяпер ёсць такая тэндэнцыя?

— На жаль, ёсць, і гэта самае для мяне страшнае. Але давайце не будзем пра сумнае.

— Ці адчуваеце вы творчую канкурэнцыю? І калі так, дык з кім?

— Найперш я сам сабе канкурэнт, і вельмі жорсткі — бо ніколі не раблю абы-як. Стаўлюся да сябе заўсёды вельмі патрабавальна, і палёгкі не дапускаю нават у дробязях. Бо разумею, што важна не толькі трымаць дасягнутую планку, але і пастаянна яе павышаць, развівацца. Мяркуючы па водгуках публікі, нам гэта ўдаецца.

Беларускі дзяржаўны маладзёжны тэатр працягвае актыўна засвойваць камерную прастору: у Малой зале адбылася прэм'ера спектакля "Чалавек з Падольска". Але меркаванні карэспандэнтаў "К" пра яе падзяліліся.

Спевы Дзяніса Маісейчыка і Кірыла Навіцкага чутны у двары.

Думкі пра "Чалавека"

Толькі чаму менавіта яна?

Першая п'еса расійскага пісьменніка і паэта Дзмітрыя Данілава лічыцца вельмі паспяховай. Яна стала лаўрэатам конкурса новай драматургіі "Рэмарка-2017", была апублікавана і атрымала безліч прыязных рэцэнзій, паказвалася грамадскасці некалькіх расійскіх гарадоў у варыянце чыткі. Летась у маі пастаўлена ў маскоўскім Тэатры.doc, у жніўні — у Нарыльскім Запалярным тэатры драмы імя Уладзіміра Маякоўскага. Ну, а цяперашняя прэм'ера ў Мінску прынесла п'есе і аўтару замежнае прызнанне.

Але рэжысёр Дзмітрый Багаслаўскі, які працуе таксама артыстам Маладзёжнага тэатра і адначасова вядомы ў нашай краіне і ў Расіі як запатрабаваны драматург, зрабіў з п'есы штосьці цалкам ёй супрацьлеглае — са зместам навыварат. Цягам амаль дзвюх гадзін мы назіраем не толькі "падынак" між паліцэйскімі і затрыманым, але яшчэ больш займальную "дуэль", дзе дазваляецца неабмежаваная колькасць стрэлаў між п'есай і спектаклем. Хто ж з іх перамагае?

Не, рэжысёр не "здзекуецца" з тэкста, ён захоўвае яго практычна ў арыгінале. Хіба дадае ў фінале некалькі фраз — бязгучна, праз відэапраекцыю. І робіць з другога затрыманага — Сяргея з Мыцішчаў — перапранутага паліцэйскага. Але сэнс прынцыпова змяняецца!

П'еса, як і амаль уся творчасць Данілава, уяўляе з сябе, па словах аднаго з расійскіх крытыкаў, "Паравозік з Рамашкава для дарослых". Толькі ўсхваляецца не прырода, як у мульціку, а "шэрая будзённасць" і ўсялякія вулічна-побытавыя дробязі, што атачаюць нас у гарадах і асабліва ў іх прамысловых зонах. Ну, а ў дадзенай п'есе, калі верыць інтэрв'ю, Данілаў хацеў паказаць паліцэйскіх "зусім не такімі стэрэатыпнымі ментамі, якімі мы прызвычаіліся іх бачыць". Менавіта гэтыя "правільныя" паліцэйскія, размахваючы дубінкамі, "гавораць герою правільныя рэчы, пашыраюць яго погляд на рэальнасць". Тут бачыцца працяг тэледыскусій і шырока распаўсюджанай грамадскай думкі пра веліч крывавых уладароў, адбітак тэлесерыялаў пра цудоўных спецыялістаў, якім дазволена маральна здзекавацца з людзей, прыніжаць іх, парушаючы ўсе этычныя нормы.

Дый вучыць гэтая, на маю думку, жудасная п'еса не таму, як пераўтварыць Падольск у Амстэрдам, а як задавольвацца тым, што ёсць — і не марыць пра большае, бо ўсё роўна не будзе. Радавацца "безлічы адценняў шэрага". Размалёўваць рэчаіснасць у сваіх фантазіях таксама не трэба — яшчэ невядома да чаго можна дамалявацца-дадумацца. Лепей — не думаць. А проста "счытваць" усё, што мільгае за вакном. Дык чым такое эстэцтва адрозніваецца ад інтэрнэт-залежнасці, калі "піпл хавае" прапанаваны яму прадукт?

Тэма спектакля гучыць іначай: "Мы тебя научим, как Родину любить". У пэўны момант мы ўсе пачынаем адчуваць сябе арыштаванымі, асабліва калі паліцэйскія ходзяць па зале.

Вучыць спектакль таксама іншаму — задумвацца. Бо ў фінале пасля дададзеных быццам бы правільных заклікаў кшталту "Паглядзіце налева, вазьміце за руку суседа, усміхніцеся" ўзнікае яшчэ адна фраза, папраўдзе вызначальная: "Толькі што вы падпарадкаваліся звыкламу надпісу на сцяне". Дык што важней — надпіс ды іншыя звыкласці, якія літаральна гіпнатызуюць, ці ўласныя думкі?

Рэжысёр у чарговы раз даказвае, што ўмее добра абжываць прастору: ён удала абыгрывае і вокны, і падваконне, і вертыкальную трубу-слуп (чым не подступы да тэатра site-specific?). Вынаходліва візуалізуе асобныя фразы (на словах "вылецела зусім", што азначае "забыўся", з тэчкі вылятаюць блёсткі). Выкарыстоўвае відэапраекцыю са спасылкамі на тэатр масак і клаўнаду (пачынаецца спектакль з надпісу "АУС інфармуе: адключыце мабільныя тэлефоны", надалей твары паліцэйскіх на відэа — выбеленыя). Добра працуе са святлом. У выніку рэжысёрскае жанравае азначэнне "аператыўная распрацоўка" набывае яшчэ адзін сэнс: п'еса выдатна распрацавана пастаноўшчыкам і надзвычай аператыўна. Ды толькі чаму менавіта яна? Дзеля згаданага пераадольвання "супраціўлення матэрыялу"?

Надзея БУНЦЭВІЧ



Марына Блінова ўздзейнічае на героя Дзяніса Аўхарэнкі ласкава, але жорстка.

Ілюзорная непахіснасць асобасных межаў

У восеньскім інтэрв'ю "К" (№ 46 за 2017 год) Дзмітрый Багаслаўскі, згадваючы пра пачатак працы ў Маладзёжным над спектаклем "Чалавек з Падольска", выказаўся пра сваю новую рэжысёрскую работу так: "Гэта пастаноўка не пра што іншае, як пра з'яўленне новай формы жорсткасці — тут і цяпер". Падчас нядаўняй прэм'еры публіцы паказалі бязлітаснасць псіхалагічнага гвалту над людзьмі.

У мінімалістычна аздобленай прасторы Малой сцэны Дзмітрый Багаслаўскі замыкае сярэднестатыстычнага гараджаніна і паліцэйскіх новай фармацыі, якім загадана не ў парушэннях разбірацца, а займацца выхаваўчай работай. Здавалася б, у той знарок зацемненай скрыні ўчастка ёсць адчыненыя дзверы — устань і пакінь месца абсурдных тэстаў і эмацыйнага націску. Аднак каб зрабіць крок з тэрыторыі знявагі, трэба ўмець адстойваць асобасныя межы. Дык ці атрымаецца ў нас тое зрабіць?

Сучасныя псіхолагі пільна даследуюць пакаленне Y — людзей, дзяцінства якіх выпала на 1990-я. Большасць з іх выраслі ў дастатку, мелі магчымасць шмат вандраваць па свеце, дзякуючы інтэрнэту, атрымалі бязмежны доступ да інфармацыі. Усё гэта дазваляе моладзі дакладна вызначыць, чаго яна ў жыцці сапраўды не хоча і што проста зараз прагне мець. Вось толькі мілініялы не ўсведамляюць, што для дасягнення мары неабходна прыкласці намаганні ці, як мінімум, пачаць дзейнічаць.

Галоўны герой п'есы расійскага драматурга Дзмітрыя Данілава — яскравы прадстаўнік тых самых мілініялаў. Персанаж акцёра Дзяніса Аўхарэнкі ўпэўнена пералічвае са сцэны, што яму не даспадобы: жыць у Падольску, штодня ездзіць шэрымі аднастайнымі вуліцамі, хадзіць на абрыдлую работу, жыць з нялюбай. Аднак змяніць што-небудзь хаця б у сабе, не гаворачы пра атачэнне, ён не гатовы, бо шлях да мары бачыцца складаным ды вымагае ад чалавека напружання, самааналізу і рэальных крокаў. Герой працягвае дзесяцігоддзямі сядзець у агідным яму горадзе і ўдасканальваецца толькі ў красамоўстве злавання на свет.

Вось толькі фокус у тым, што, калі ты сам не паварушышся, прыйдуць тыя, хто хутка цябе зацягне ў гульню па сваіх правілах.

Андрэй Гладкі з затрыманага хутка ператвараецца ў паліцэйскага.

І дзейнічаць будуць акуратна: ніхто ўжо не лупіць наводмаш, а карыстаецца вытанчаным наборам псіхалагічных прыёмаў. Персанажы Марыны Бліновай, Кірыла Навіцкага, Дзяніса Маісейчыка, Андрэя Гладкага не-не ды і кідаюць млявыя погляды, змяняюць голас, пры гэтым не забываючыся спакваля то крэсла апусціць, каб падследны быў ніжэйшы за начальніка, то патрабаваць называць сябе замест таварыша "госпожой", каб было дакладна зразумела, хто каму падпарадкоўваецца.

Чалавек не заўважае, як яго замыкаюць у клетку стэрэатыпаў, ён сам перастае мысліць крытычна. Замест таго, каб прааналізаваць, што насамрэч можна змяніць у родным старадаўнім горадзе, каб бачыць штодня не шэрасць, а сапраўдную гістарычную перліну, пачынае зашорвацца па прынцыпе "не трэба нам бераг турэцкі". І вось ужо абсурднасць абставін падаецца апраўданай неабходнасцю... Менавіта так гэтае пакаленне, што не звыкла адстойваць сваю сістэму каштоўнасцяў, можна лёгка збіць з панталыку і павесці ў патрэбным камусьці кірунку.

Упэўненыя, што вы не такія, як небарака з Падольску і зможаце супрацьстаяць абсурдным загадам? У фінале Багаслаўскі праводзіць асабісты тэст: выводзіць на сцяну бягучы радок з настойлівым патрабаваннем да публікі. А затым, калі яна яго выконвае, быццам абдае яе халоднай вадой: паглядзіце, вы ўжо скарыліся простаму надпісу... Спектакль прапануе перш-наперш разабрацца ў сабе, адважыцца разарваць ланцуг манатоннасці свайго жыцця і незадаволенасці самім сабой. Інакш нехта хвацкі вырашыць гэта за вас.

Настасся ПАНКРАТАВА
Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

КУЛЬТУРА WWW.KIMPRESS.BY № 7 / 17 ЛЮТАГА 2018 г.

Тры ў адным

У сталічнай мастацкай галерэі "Універсітэт культуры" адначасова праходзяць тры выставы:"Світанак" — графічныя творы дагестанскага мастака і пісьменніка Марата Гаджыева, якія ў тым ліку з'яўляюцца і прэзентацыяй узораў сучаснай кніжнай культуры Дагестана, а таксама экспазіцыя грамадскага аб'яднання "Гільдыя керамістаў" і персаналія мастака Аляксандра Адамава.

Марат Гаджыеў. "Калібры".

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ / Фота аўтара і Паліны КАСМАЧОВАЙ



Фрагмент экспазіцыі Аляксандра Адамава.

Галерэя, як вядома, спецыялізуецца на камерных выставах. Прычым, часта прадастаўляе сваю плошчу для дэманстрацыі мастацтва эксперыментальнага ці экзатычнага для беларускага вока. Вось і творы Марата Гаджыева прыадкрываюць для нас свет дагестанскага народа, што не адно стагоддзе існуе на памежжы дзвюх сусветных рэлігій і розных этнакультурных абшараў, захоўваючы пры гэтым вернасць адвечным каштоўнасцям сваёй зямлі. У творах мастака адчуваецца і ўгліў старажытнай культуры Усходу, і еўрапейская мастацкая традыцыя. Малюнкі зроблены тушшу, іншы раз з даважкам пастэлі, на паперы ручной работы. У гэтай рукатворнасці, бадай, іх галоўная вартасць. На іх адпачывае вока пасля камп'ютарнай графікі. Але каб аб'ектыўна ацаніць мастацтва Марата Гаджыева, варта мець больш шырокае ўяўленне пра этнакультурны кантэкст, у якім яно нарадзілася. А гэта ўжо па-за межамі экспазіцыі.

"Гільдыя керамістаў" назвала сваю выставу "Між рукамі і полымем". Ідэя стварэння аб'яднання належыць Святлане Цап, Алесе і Вадзіму Козічам. Удзельнікі "Гільдыі..." маюць розную адукацыю, але яе стрыжань складаюць выпускнікі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Работы, прадстаўленыя ў галерэі, можна трактаваць як вынік творчых пошукаў аўтараў з улікам рынкавых запытаў. Тут ёсць, бадай, усё, чым можна аздобіць жытло, надаць яму ўтульнасці — ад гліняных фігурак паненак у строях часоў, што з сённяшняга гледзішча вабяць рамантызмам, да арыгінальнага посуду і кампазіцый метафарычнага зместу.

Фрагмент экспазіцыі "Гільдыі керамістаў".

Пра выставу Аляксандра Адамава скажу, што яна, так бы мовіць, на аматара і складаецца з інсталяцый і жывапісных кампазіцый з элементамі прадметнага калажу, якія дэманстратыўна вытыркаюцца з ілюзорнай прасторы. Хочацца верыць у шчырасць аўтара, у тое, што неахайнасць выканання і эскізнасць мыслення абумоўлены творчай канцэпцыяй. Але мне падаецца, што ў дадзеным выпадку прыёмы, запазычаныя ў "андэграўнду" 1980-х, а таксама пафасныя тэксты, што справаджаюць згаданыя аб'екты, мусяць схаваць недахоп прафесіяналізму. Шэдэўр, зрэшты, можна зрабіць і са смецця, але не ўсялякае смецце варта цягнуць на выставу.

К

У Арт-гасцёўні "Высокае места" праходзіць выстава мастацкага тэкстылю і касцюму. Экспануюцца творчыя работы студэнтаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, выкананыя ў 2015 — 2017 гадах. Назва пазычана з камп'ютарнага лексікону — "Гіперсувязі". Такім чынам арганізатары імкнуліся падкрэсліць камунікатыўную сутнасць сучаснага мастацтва, ягоную адкрытасць навацыям і эксперыменту.

Запрашэнне зазірнуць за кулісы

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ / Фота аўтара

Выстава разлічана на шырокую аўдыторыю. Ад прафесіяналаў, якім цікавыя тэхналагічныя і сэнсавыя навацыі, аўтарскія тэхнікі, да звычайных спажыўцоў прыгожых рэчаў, што не бачаць вялікай розніцы паміж залай музея і гандлёвай прасторай кірмашу. У экспазіцыі — работы, выкананыя студэнтамі спецыяльнасцей "мастак па тэкстылі" і "мастак па касцюме" ў 2015 — 2017 гадах. Цяпер яны ўжо выходзяць на дыплом і, магчыма, штосьці з прадстаўленага тут трансфармуецца ў творы, якія завяршаюць навучальны працэс і даюць права называцца прафесіяналам.

Па маіх назіраннях, на кафедры, дзе рыхтуюць згаданых спецыялістаў, творчыя пошукі і скіраванасць на эксперымент вітаюцца. У гэтым я неаднойчы пераконваўся менавіта на абаронах дыпломаў. Больш за тое, студэнтам дазваляецца такая ступень свабоды, што не кожны здольны яе скарыстаць. Зрэшты, нічога дзіўнага: навука свабоды лёгка не даецца... На выставе ж якраз і экспануюцца работы ў большай ступені творчыя, чым вучэбныя. Але па іх відаць, да якой рэчаіснасці рыхтуюць студэнта, на які вынік скіраваны навучальны працэс. І як самі студэнты ўяўляюць сваю будучыню. Яны ўсведамляюць, што, магчыма, давядзецца займацца справай, далёкай ад пазначанай у дыпломе прафесіі, што адным рамяством без крэатыву сёння не абыдзешся.

Бадай, самая эфектная частка экспазіцыі — касцюмы, выкананыя па матывах творчасці Анры Маціса, Марка Шагала, Соні Дэланэ, Пабла Паласуэла, Уолтэра Дэкселя. Усё гэта класікі XX стагоддзя. Аўтары ў той жа паслядоўнасці — Аляксандра Логвіна, Надзея Малафей і Таццяна Кавалёва, Настасся Хлус, Наталля Раманенка, Юлія Айплатава. Работа над тэмай пачыналася з уваходжання ў вобразны лад славутых мастакоў і стварэння так званых канцэптуальных планшэтаў на аснове іх стылістыкі. А далей ужо непасрэдная праца над касцюмам. Калі ў такім строі з'явіцца на вуліцы, на цябе будуць азірацца, але для сцэны ці выставачнай прасторы — сама тое. Надзея Малафей прадставіла яшчэ і распрацоўку касцюмаў для спектакля "Дванаццатая ноч" паводле Шэкспіра.

Другі экспазіцыйны блок — аб'ёмныя і малафарматныя насценныя кампазіцыі. Некаторыя з іх да тэкстылю маюць вельмі ўмоўнае дачыненне. Гэта хутчэй творчая лабараторыя, у кантэксце якой студэнты шукаюць формы і метады спалучэнняў нітак з іншымі матэрыяламі. Так, у кампазіцыі "Гадзіннік жыцця" Аліны Самсановіч скарыстаны воўна, акрыл, гума, сінтэтыка, метал, спалучаны традыцыйнае ручное ткацтва і аўтарская тэхніка. "Чорная дзіра" ў трактоўцы Вікторыі Ярохінай уяўляе з сябе адмыслова скручаны дрот з фрагментамі тканіны. У дыптыху Ірыны Банькоўскай "Месяцовыя кратары" скарыстаны бавоўна і паралон. Пры наяўнасці пэўнай эстэтыкі і вобразнасці, ён усё ж падаецца мне праявай тупіковай тэндэнцыі, калі матэрыял вымушаюць працаваць не ў сваім натуральным рэжыме, але імітаваць нешта іншае. У дадзеным выпадку кампазіцыя нібыта з тканіны, але глядзіцца як металічная. Падобнае даводзілася мне ўжо назіраць у кераміцы. Межы паміж творчымі спецыялізацыямі закрытымі быць не могуць, але цалкам пераходзіць на чужое поле, мабыць, усё ж не варта.

Аб'ёмным тэкстылем сёння ўжо нікога не здзівіш, але ўспрымаецца ён зболышага як чыста выставачны і канкурэнцыю традыцыйнай аздобе інтэр'ераў пакуль не складае. У экспазіцыі гэты напрамак прадстаўлены, у прыватнасці, трыпціхам Марыі Разумовіч "Гісторыя ткацтва. Нараджэнне. Залаты век, Індустрыя". Гэта вобразны аповед пра творчую прафесію ў кантэксце цывілізацыі. Таксама вабіць вока кампазіцыя Маі Сцепанько "Гранат багіні ўрадлівасці". Цікавая ўжо сама спроба выявіць складаны тэматычны кантэкст праз абстрактныя ці блізкія да абстракцыі формы.

Актыўнае выкарыстанне лічбавага друку (Настасся Луцэвіч "Кругі на вадзе", Ірына Банькоўская "Скарына. Праз глыбіню стагоддзяў") пашырае тэхналагічны патэнцыял тэкстылю і можа стаць эфектыўным інструментам у руках таленавітага мастака.

У мяне ад наведвання выставы засталося ўражанне, нібыта я быў у майстэрні і пабачыў мноства эскізаў, адносна якіх і сам мастак пакуль не вызначыўся: не ведае, што з іх трансфармуецца ў сапраўдныя творы, а што так і застанецца эскізамі, накідамі, падрыхтоўчым матэрыялам. Але зазірнуць за кулісы творчага працэсу заўжды цікава.

К

Дасканаласць незавершанага

У маі гэтага года Уладзіміру Вітко спаўняецца 85 гадоў. Не сумняюся, што адзін з найстарэйшых віцебскіх мастакоў яшчэ здзівіць і ўзрадуе сваімі юбілейнымі выставамі. Ён таксама і адзін з найбольш энергічных, нават калі гаварыць наогул аб усіх пакаленнях. А не дае спыніцца яму, як прызнаецца сам жывапісец і графік, бесперапынная праца думкі. Менавіта думка зрушае на аналіз маніпулятыўных і натоўпаўтваральных тэндэнцый, неад'емна ўласцівых сучаснаму соцыуму. Пакуль жа выстава яго работ працуе ў Віцебскім мастацкім музеі.

Уладзімір Вітко. "Мы".

Аднак мастацтва Уладзіміра Вітко — не "ад галавы", яно ідзе ад сэрца, якое паводле традыцыйных вучэнняў з'яўляецца цэнтрам чалавечай натуры. Ад галавы — творчы аналіз сацыяльных працэсаў, як мінулых, так і цяперашніх. Мастак, які ахапіў сваім жыццём некалькі эпох, можа разгледзець сувязь мінулага і сучаснасці. Вось толькі смеласці адлюстраваць усё так імпульсіўна і шчыра, не баючыся здацца "дзіўным" нават для сваіх калег, хопіць далёка не ў кожнага.

Мастацтва Уладзіміра Вітко з'яўляецца страшным культурны пласт з нашага асяроддзя.

Гэтая канстатацыя адбываецца па-рознаму. Мастак можа выказваць дынаміку чалавечай дэструкцыі праз міфалагічныя вобразы — напрыклад, у карцінах "Медэя", "Пацалунак Юды" альбо "Чорны Крумкач". Скажоныя, карыкатурныя маскі, якія ўжо толькі аддалена нагадваюць чалавечыя твары, паказаны ў работах "Аратары", "Маска", "Профілі", "Кубак гарэлкі на стале". У многіх карцінах Уладзіміра Вітко мы бачым абязлічаныя чалавечыя фігуры, якія знаходзяцца або ў нявызначанай прасторы, адпаведнай іх няяснай існасці ("Сяброўкі", "Навіны", "Адпачынак", "Куды ісці?"), або ў варожым для сябе асяроддзі ("Мы", "Трывога", "Зямля ў агні", "Радыяцыя").

Варожае асяроддзе выяўляецца і само па сабе, інспіраванае невядомымі для чалавека сіламі, відавочна нядобразычлівымі ў адносінах да яго і зацікаўленымі ў сілкаванні яго энергіяй самаразбурэння (графічная і жывапісная "Энергія", "Ахвяруючы сабой"). Нарэшце, у творах Вітко адлюстраваны трывожны стан прыроды, які нагадвае карціны біблейскага "Апакаліпсісу" — выкрыццё дэструктыўнасці самога чалавека ("Чырвоная зямля", "Чырвоная вада", графічны "Рух", "Удар па зямлі").

Такі разнастайны характар сімвалізму кажа аб комплексным падыходзе мастака да глабальных праблем антрапагеннага асяроддзя, бо справа не абмяжоўваецца толькі крытыкай чалавеканенавісніцкіх ідэалогій ці гістарычнай тэматыкай вайны, якія таксама можна разгледзець у яго творах.

Уладзімір Вітко кажа аб аднастайнай прасторы "аднамернага чалавека", які, паводле выразу Фрыдрыха Ніцшэ, ужо нават не здатны пагарджаць самім сабою. Міхаіл Бахцін характарызаваў існаванне такіх абязлічаных і абнуляваных соцыумам асоб як "хлусня самім сабою сабе самому". Праблематыка, пра якую апавядае ў сваіх мастацкіх творах Уладзімір Вітко — недзе па-над паўсядзённасцю, па-за прамінальным часавым вымярэннем. Таму мы і можам казаць, што яго работы маюць дачыненне да метафізікі соцыуму.

Паказальна, што з цягам часу жывапісныя работы Уладзіміра Вітко ўсё болей набываюць характар графічнасці, а графіка — свайго кшталту эскізнасць. Такая маляўнічая графічнасць прадугледжвае збліжэнне твораў мастака з мастацтвам слова, якое перадае актуальны стан асяроддзя — і ў той самы час з'яўляецца асноўным сродкам абвяшчэння і перадачы ідэй аб боскай тэлеалогіі ў дачыненні да чалавека і рэчаіснасці. Эскізнасць жа дазваляе дасягнуць максімальнага ўвядзення мастацкага свету ў асабістую прастору гледача, які павінен нібы завяршыць карціну праз актыўную працу ўласнага ўспрымання. Бо завершаны твор, хоць і прымушае сабой любавацца, але прадугледжвае няяўнасць пэўнай дынстанцыі. Парушаючы яе, мастак дасягае пастаўленых ім задач у дасканаласці незавершанага.

Георгій КАРЖАНЕЎСКІ

Аўдыя & Відэа

Алег КЛІМАЎ, спецыяльны карэспандэнт "К"



Вольга БРЫЛОН, музыказнаўца

Студзеньскія аўдыя/відэаработы айчынных выканаўцаў рэцэнзуюць музыказнаўца Вольга БРЫЛОН (А.) і спецыяльны карэспандэнт газеты "Культура", музычны крытык Алег КЛІМАЎ (В.).

АЎДЫЯ

Гурт Ru.St, альбом "Суп з соллю"

А.: Чацвёрты студыйнік у гурта — гэта крута! Тым больш, што праца над ім пачалася аж у 2013 годзе, а "рэальная студыйная праца" — у 2016-м. Гэта ж колькі часу спатрэбілася, как запісаць 9 песень? Але Уладзімір Рудзік выклікае павагу адданым служэнням року. Сам ён выдатна ведае, адкуль, па яго ж выразе, "растуць ножкі" ўласных рок-алюзій і запазычанняў. Простых ж слухач спрабуе засяродзіцца, напрыклад, на тэкстах, альбо на асаблівасцях вакалу, альбо спрабуе ацаніць якасць ігры музыкантаў. Зрэшты, каго цяпер здзівіш гітарнымі фузамі і барабаннымі збіўкамі? Усе іграюць прыкладна адналькава, таксама, як і спяваюць, складаюць тэксты. Насамрэч, не прыйдзе ж у галаву назваць словы кампазіцый гурта Ru.St паэзіяй! Гэта, хутчэй, набор нейкіх вельмі спецыфічных вобразаў-сімвалаў. На аматара, як кажуць. Манера спеваў Рудзіка нагадала мне адначасова Юрыя Шаўчука і — больш аддалена — Віктара Цоя. І сам лідар каманды, і ўсё ў гэтым альбоме нешта і некага нагадваюць. На маю думку, гэта і ёсць галоўны недахоп рэлізу.

В.: Студзень выдаўся бедным на альбомы і міні-альбомы беларускіх музыкантаў, калі не сказаць больш. Таму давялося звярнуцца да аднаго са снежаньскіх рэлізаў, які "пад раздачу" рэцэнзентаў яшчэ не трапіў. Сапраўдны мужчынскі рок, блюз-рок ад калектыву з Бабруйска. Без смаркатых маленняў да процілеглага полу, з дымам цыгарэт без ментолу, са спустошанай бутэлькай таго, што гарачэйшае. Гэткая дэманстрацыя ўнутранага свету прадстаўніка моцнай паловы чалавецтва, агаленыя пачуцці і эмоцыі індывіда посткрызіснага перыяду. Цалкам прыдатны рэліз для кампаніі крыху ап'янелых аднагодкаў. Б'ёмся шклянкамі пад трэк "Фрыда".

ВІДЭА

Kakora, кліп на песню "Кантралёр"

А.: Калі б не "К", дык абмінула б гэтае дзіва і не прычасцілася б! Хлапец так шчымліва енчыць, скуголіць і стогне, што хочацца прытуліць яго да грудзей. Але з гэтым трэба асцярожна, бо ён жа сам кажа: "Печально хочу", а потым як крыкне: "Сиськи!" Думаю сабе: і што ж яго гэтак каўбасіць? Па начах не спіць, святла шугаецца? Ці, можа, я вельмі старая для маладзёжнай хіп-хоп-культуры, каб успрымаць гэтую "творчасць" усур'ёз?

У хлопца благая дыкцыя, а ў гукарэжысёра слых, таму што ён не здолеў правільна запісаць голас на мікрафон і даць выканаўцы вартыя тэхнічныя заўвагі. А вось кліпмейкер — малайчына! Зрабіў з гэтай ахінеі выдатны экспрэсіўны відэашэраг. Няхай Kakora есць дранікі! Няхай падрастае хлапчанё!

В.: Куды ж сёння без рэпу? Нікуды нельга схавацца нам... Каб яшчэ было ясна, пра што нам вяшчае гэты малады чалавек, а то разумееш толькі асобныя словы і словазлучэнні. У прыватнасці, гаворка ў трэку ідзе, мабыць, аб бескампрамісным супрацьстаянні кантралёра і пасажыра аўтобуса. Хутчэй за ўсё, ролю апошняга і выконвае рэпер — люта, на мяжы нервовага зрыву: тая яшчэ, не выключана, заруба была паміж безбілетнікам і візаві. Кліп з дапамогай рэзкіх рухаў цела выканаўцы і нейкай "кіслотнай", у рысках і каляровых плямах карцінкі ўзмацняе тую напружанасць. Зараз, напэўна, варта чакаць кампазіцыі ад кантралёра, дзе будзе выкладзена яго пазіцыя. Выразнасці толькі ад яе хацелася б.

Гурт "Харлі", кліп на песню "Зіма"

А.: Гурт "Харлі" вырашыў грымнуць сваёй, мясцовай "зарыхай", але з сапраўды рускім размахам! І ў тэксце ўсё для гэтага маецца: для пачатку — заліхвацкае "ой, порадуемся!", потым, як і належыць, — "поклонюсь матери", "прижмусь крепче к отцу" (а як жа ж!), а галоўнае — "выйду полем пройдусь"! Тут яўна не хапіла "эх", "ай люли", "гой еси" ды яшчэ каня, бо як жа можна — па полі зімой ды без каня? Маўчу пра валагодскае "оканье" і пра тое, што слоў у прыпеве ўвогуле не разабраць. І без таго шмат бязглуздзіцы, у тым ліку стылёвай. Пачынаецца песня са славянскага найгрыша акарыны, а заканчваецца ўсё той жа "скрыпкай Рыбака" з умоўна скандынаўскім матыўчыкам. У выніку — кітч. Нізачот!

Прапаную фінальны кадр кліпа: Яўген Чалышаў пасярод заснежанага поля — на кані ў касцюме Дзеда Мароза з пышнай кучаравай барадой, але ў будзёнаўцы і са скрыпкай. Подпіс: "Хороводит немыслимо — зима".

В.: А недзе ёсць сапраўдная, снежная зіма, не хлушу, далібог! І ВІА "Харлі" мне ў дапамогу. Карцінка гэтая выдатна "зайшла" б у навагоднія святы, калі познім вечарам-ноччу на вуліцу з акна глядзець зусім не хацелася — ні сняжынкі, ні лёгкай мяцеліцы, нават выбухі петард не прыхаршвалі незадаволенасць надвор'ем. А тут глядзіш — і, як сказаў бы жывы класік, настрой паляпшаецца. Лясы, белыя шматкі валяць, людзі на каньках катаюцца — добра! І песня пасуе відэа — прыбраная, пухнатая, крыху сумная і бадзёрая. А з пацешнага — часам найграны акцэнт фронтмэна калектыву Яўгена Чалышава, гэтакі валагодскі гоман з яго спецыфічным вымаўленнем літары "о".

Гурт Tempo Bay, кліп на песню Disco Ball

А.: Даволі прыемная на слых кампазіцыя, замешаная на чатырох немудрагелістых нотах. Тым не менш, тут ёсць выразны меладычны зачын, які так моцна ўбіваецца ў падсвядомасць, што ў канцы песні ты амаль што любіш гэтыя навязлівыя ноты! Дый вакал прыемны, калі не лічыць няўлоўнага падабенства са знаёмымі інтанацыямі Аляксандра Рыбака. Міжволі згаджаешся са скупымі каментарыямі ў "сетцы": "Годится", "Кайф", "Старайтесь, парни" и "Потенциал есть". Кучаравы сюжэт кліпа пад умоўнай назвай "Як забівалі Менестрэля" выклікае шмат эмоцый. Нейкі лысы хрыч, па сумяшчальніцтве — кампазітар-аматар і мафіёзны бос, які аддалена нагадвае помесь Фантамаса і аднаго вядомага прадзюсара, — вырашае "згвалціць" сваёй суперпесняй навакольнае асяроддзе. У якасці спевака абраны цнатлівы Менестрэль з гітарай, якога вераломна выкрадаюць, а затым забіваюць як не прайшоўшага прымусовы кастынг на найлепшага выканаўцу. Няўжо на чарзе — Саладуха з Хлястовым? Хорар з падаючым у пясок штучным вокам ды змярцвелы Менестрэль з дзіркай у ілбе ствараюць незабыўнае "послевкусие" ад прагляду кліпа.

І фінальнае пытанне: Tempo Bay — гэта што, сапраўдныя беларусы? (Па аналогіі з вядомым фільмам мяркуецца няпэўны адказ "…Да!").

В.: Сюжэт роліка: малады мужчына з дзвюма "гёрламі" пад'язджае да вулічнага музыканта і пра нешта з ім загаворвае. Той яго слухае вяла, бо цалкам пагружаны ў зялёныя вочы адной з дзяўчат. Потым ён, гледзячы на бландзінку, на нешта пагаджаецца, вось ужо ўся чацвёрка кудысьці коціць на легкавушцы. Падчас прывалу з вогнішчам будучы Ігар Саруханаў застаецца з прыгажуняй, што яе, напэўна, сябрам, вядома ж, не падабаецца. І як толькі справа не даходзіць да нявіннага пацалунку, будучага Леаніда Агуціна ўсыпляюць хусткай, прамочанай чымсьці сонным, і звязваюць. Троіца (!) тым, што здарылася, задаволеная, нават непацалаваная яе трэць, якая скідае на пясок нешта кшталту малахітавых кантактных лінзаў і здымае парык (яе калегахлопец таксама дэманструе свае натуральныя прычоску і колер валасоў). Крымінальная групоўка дастаўляе будучага Віталя Карпанава ў нейкае памяшканне і прадстаўляе яго лысаму верхаводзе. Памочнік "аўтарытэта" працягвае будучаму Аляксею Хлястову ліст паперы і накіроўвае да таварышаў-музыкантаў, што, скаваныя адной мэтай, ужо знаходзяцца на "хазе". На лістку, мабыць, накрэслены тэкст песні і ноты мелодыі. Будучы Аляксандр Саладуха старанна спявае, інструменталісты старанна граюць, але выкананне гангстару не падабаецца. "Канчай", — махае рукой ён "шасцёрцы", і той выцягвае "ствол" у бок, здавалася б, будучага гурта Tempo Bay... Дзеянне пачынае раскручвацца назад, але заканчваецца спакоўваннем нейкіх цел у мяшкі для трупаў. На змену забітаму вулічнаму акыну ўжо без будучыні ў пакой да бандыта запіхваюць наступную творчую ахвяру. Але аказваецца, гэта яшчэ не ўсё! У фінале мяшкі з нібыта мерцвякамі варушацца і становяцца вертыкальна. "НТБ" адпачывае, каракеі. Мараль: кампазіцыю гэтую — нядрэнны англамоўны сярэднетэмпавы трэк ад індзі-каманды — з яе відэашэрагам трэба ў абавязковым парадку, пад подпіс, паказаць усяму без выключэння айчыннаму спяваючаму шоу-бізнесу: хай задумаецца, як нам яго слухаць...



Маладога агранома пакахаць

Тэлефаную ў Крэўскі дом культуры, што на Смаргоншчыне. Адказваюць: “Выбарчы ўчастак слухае”. Аказваецца, дырэктар установы Жанна Бартош кіруе яшчэ і працэсам выбараў дэпутатаў мясцовых саветаў. Справа для работнікаў культуры звычайная. Але цікавіла мяне не толькі гэта. Клубная ўстанова ў Крэве запомнілася калісьці тым, што хоць і наведаў яе познім вечарам, аднак не пашкадаваў: у гуртках займалася вялікая колькасць дзяцей. Так што клубнае жыццё тут — надзвычай актыўнае.

Яўген РАГІН

Ведаў, словам, куды тэлефаную. І гэтым разам размова не была дарэмнай. Жанна Мікалаеўна распавяла, што **Крэўскі** дом культуры выступіў са справаздачай на раённым аглядзе-конкурсе ў **Смаргоні**. Журы ўхваліла тэатралізаваную дзею “Прыезд маладога спецыяліста”. Аўтарам яе стала мастацкі кіраўнік клуба Алена Міхалькевіч. Тут — свая гісторыя. Алена Віктараўна працавала бухгалтарам. У сталічным Інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў атрымала другую прафесію. З клубнымі калегамі актыўна кантактавала. Таму прыехала дахаты актыўная і натхнёная. Так і нарадзіўся “Прыезд маладога спецыяліста”. Сцэнарый вось які. У вёску прыязджае малады аграном (курсант Мінскай вайсковай акадэміі Сяргей Смолік), сустракае дзяўчыну (дзевяцікласніца Ларыса Міхалькевіч, не дачка Алены Віктараўны — аднафаміліца). Як затрымаць маладога спецыяліста на першым месцы працы? Тут адно спадзяванне — на каханне. Так і атрымалася. Дзяўчына ўшчыльную занялася выхаваннем хлопца, які раней вёскі не нюхаў, беларускай мовы не ведаў, адно толькі паруску размаўляў. Каханне ж цуды робіць. Напрыканцы тэатралізацыі аграном пачынае ўпэўнена размаўляць на роднай мове, збіраецца пабрацца шлюбам з дзяўчынай і застацца ў вёсцы назаўжды. Уяўляеце, наколькі выразна прагучала б тэма, калі б ролі выконвалі сапраўдныя маладыя спецыялісты? Тым не менш, заслуга крэўскіх клубнікаў відавочная. Справаздача атрымалася нешараговай.

На здымках:
1 Песня для морынскіх аматараў зімовай рыбалкі.
2 Круглы стол у Музеі-сядзібе Міхала Клеафаса Агінскага.
3 Узнагароду атрымлівае ганцавіцкі разьбяр Аляксандр Свірыд.

Яшчэ адзін прыклад удумлівага падыходу да арганізацыі нестандартнага мерапрыемства. 11 лютага ў аграгарадку **Морына (Іўеўшчына)** прайшло свята “Морынская залатая рыбка”. Напісала пра гэта вядучы метадыст аддзела народнай творчасці Іўеўскага цэнтра культуры і вольнага часу Святлана Лугіна. Галоўнай падзеяй мерапрыемства стаў конкурс юшкі, якую гатавалі каманды прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў і жыхары раёна. Было абвешчана каля дзесяці конкурсных намінацый. Ці не ў палове з іх перамаглі работнікі культуры раёна. Да прыкладу, каманда Іўеўскай дзіцячай школы мастацтваў стала найлепшай у намінацыі “Самы арыгінальны рэцэпт прыгатавання юшкі”. Я паспрабаваў высветліць, у чым тая арыгінальнасць. Аказалася, школьныя спецыялісты-кухары сакрэтаў не выдаюць нават пад пагрозамі. Найлепшую прэзентацыю рыбнай стравы прапанавала раённая бібліятэка ў творчым саюзе з Музеем нацыянальных культур. У аснову сцэнарыя была пакладзена тэатралізаваная замалёўка. А вось Іўеўскі цэнтр культуры і вольнага часу перамог у намінацыі “Рыбнае багацце”. У агульным улове гэтай каманды максімальна прадстаўлены пароды рыб, якімі багаты Нёман. У канцэртна-забаўляльным забеспячэнні прымалі ўдзел работнікі культуры аграгарадкоў **Ліпнішкі**, **Геранёны**, **Суботнікі**.

Андрэй Струнчанка піша: *“Жыхары аграгарадка* **Мазалава** *(***Віцебскі** *раён) прачыталі “Ліст з Віцебска”, датаваны 1813 годам. Справа ў тым, што ў мясцовай сельскай бібліятэцы адбылося тэматычнае мерапрыемства, прысвечанае 205-годдзю з часу публікацыі “Ліста з Віцебска” дзяржаўнага і грамадскага дзеяча Ігната Манькоўскага, які апісваў жахі французскай акупацыі падчас вайны 1812 года”.*

Сэканоміць на таблетках прапаноўвае загадчык аддзела маркетынгу **Бярэзінскай** цэнтральнай раённай бібліятэкі Тамара Круталевіч. Альтэрнатыва лекам — смех! Смейцеся, бо гэта дапамагае ад мігрэні, астмы, дэпрэсіі. Урачы раяць смяяцца, каб хутчэй выздаравець. Менавіта так, кажа Тамара Круталевіч, узнікла бібліятэчная акцыя “Бальнічны клоўн”. Работнікі культуры прапанавалі пацыентам раённай бальніцы сеанс смехатэрапіі. Дасціпны гумар інтэрмедый паспрыяў агульнаму добраму настрою.

Яшчэ некалькі інфармацый з **Ашмяншчыны**. Напярэдадні Дня святога Валянціна работнікі культуры аграгарадка **Жупраны** падрыхтавалі тэатралізаваную праграму “Эпідэмія кахання”. Асабліва закаханых лячылі дадатковымі сэрцамі — валянцінкамі. Гаючы эфект аказвалі і песні пра каханне. У Ашмянах і **Гальшанах** адсвяткавалі масленіцу. На плошчы 17 верасня і ля Краязнаўчага музея разгарнуліся народныя гулянні. Прадаваліся сувеніры, прайшоў канцэрт мастацкай самадзейнасці. Не абышлося і без духмяных блінцоў.

У аранжарэі Музея-сядзібы Міхала Клеафаса Агінскага (**Смаргонскі** раён), як распавяла намеснік дырэктара ўстановы Святлана Кенька, прайшоў круглы стол “Стан гістарычных мясцін — візітоўка аграгарадка **Залессе**”. Тут сабраліся кіраўнікі мясцовых устаноў, старасты вуліц і неабыякавыя жыхары вёскі. Як і заўжды, абмяркоўвалі надзённыя пытанні. Напрыклад, музейшчыкі прапанавалі правесці ў верасні фестываль “Вяргіні да дня нараджэння Міхала”. Сярод мерапрыемстваў — не толькі канцэрт класічнай музыкі, але і выставы кветкавых дываноў, дзіцячы пленэр “Кветкавая планета”, прэзентацыя буклета “Біяразнастайнасць Залескай сядзібы”. Папярэднічаць фестывалю будуць экалагічны семінар, акцыя па добраўпарадкаванні палацава-паркавага ансамбля і аграгарадка Залессе. Кветкавая тэма абрана невыпадкова — пры Агінскім адных толькі вяргінь тут налічвалі каля 60 відаў.

Для людзей сталага ўзросту **Смаргонскі** раённы цэнтр культуры арганізаваў “Дзень шчасця”. Ветэраны дзяліліся самым патаемным: распавядалі пра сваё каханне, сямейныя ўзаемаадносіны. Мясцовыя майстрыхі прэзентавалі выставу сваіх вырабаў, распавялі, што іх натхняе на такую працу. Гучалі вершы, дэманстравалася тэатралізаваная пастаноўка. Перад гасцямі выступілі салісты народнай эстраднай студыі “Міраж” і дзіцячага танцавальнага калектыву Смаргонскага РЦК.

У рамках Міжнароднага фестывалю праваслаўных песнапенняў “Каложскі Благавест” у **Гродзенскім** абласным метадычным цэнтры народнай творчасці працуе абласная выстава 14-ці народных і ўзорных студый выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва “Святло нашае душы”. Тут прэзентуюцца найлепшыя работы з **Гродна**, **Ашмянскага**, **Ваўкавыскага**, **Навагрудскага**, **Слонімскага**, **Лідскага** раёнаў. Прадстаўлена і дзейнасць аматарскага аб’яднання майстроў народнай творчасці “Каляровая альтанка” Навагрудскага раённага цэнтра рамёстваў. Мастацкае фота прадэманстравала народная кінафотастудыя Слонімскага цэнтра культуры і адпачынку.

9 лютага майстроў народнага клуба майстроў народнай творчасці “Багач” **Ганцавіцкага** раённага дома рамёстваў і ўдзельнікаў квартэта народнага хору ветэранаў ГДК запрасілі на абласны тур XIV Рэспубліканскага фестывалю народнай творчасці ветэранскіх калектываў “Не старэюць душой ветэраны” ў **Брэсцкі** абласны грамадска-культурны цэнтр. Дырэктар Ганцавіцкага раённага дома рамёстваў Маргарыта Саланевіч распавяла, што падчас мерапрыемства былі арганізаваны выставы майстроў Марыі Раманюк (ткацтва паясоў), Аляксандра Свірыда (разьба па дрэве), Надзеі Шатроўскай (вышыўка крыжыкам і бісерам), вышывальшчыцы Веры Цалевіч і вязальшчыцы Любові Кісялевіч. Выступілі спевакі Надзея Будавей, Надзея Рэкунова, Ніна Плотка і Ніна Турко. Акампаніравала Вольга Купрыянік. Па выніках адборачнага тура разьбяр Аляксандр Свірыд атрымаў дыплом I ступені.

“У **Тарноўскім** *доме культуры, філіяле* **Лідскага** *раённага цэнтра культуры і народнай творчасці ўжо тры разы праводзіўся раённы фэст побытавых танцаў, —* напісала вядучы метадыст Лідскага раённага цэнтра культуры і народнай творчасці Ганна Некраш. — *А летась на гэтай жа базе ладзіўся абласны фестываль. Песенны фальклор даследуюць у* **Мажэйкаўскім** *доме культуры. Тут праведзены рэгіянальны фестываль імя земляка Земавіта Фядэцкага. Вуснай народнай творчасцю займаюцца драматычныя гурткі ўстаноў, а таксама — узорны тэатральны гурток “Іскрынка” і народны тэатр “Бераг”* **Мінойтаўскага** *культурна-дасугавага цэнтра”.*

Але самым жаданым, па словах Ганны Некраш, застаецца конкурс традыцыйных страў. Ужо ў трэці раз ён ладзіўся ў **Беліцкім** доме культуры. Удзельнічалі ў конкурсе 16 сельскіх устаноў культуры.

К

У Шасціснапах трымаюцца каранёў

Гэтая вёска на Чэрвеньшчыне інтрыгуе ўжо самой сваёй назвай, якую так і карціць расшыфраваць. Але ў астатнім — вёска вёска як вёска. Са сваім утоеным хараством, цішынёю і, зразумела, праблемамі — у першую чаргу, эканамічна-дэмаграфічнымі. Пра тое, як сапраўдныя патрыёты сваёй "малой радзімы" іх спрабуюць вырашыць сіламі культуры, і пойдзе гутарка ніжэй.

Алег КЛІМАЎ,
Мінск — вёска Шасціснапы Мінскай вобласці — Мінск /
Фота аўтара

Як "чалавек з народу" ўзначаліў вясковую культуру і што з гэтага выйшла

Дом культуры ў Шасціснапах.

Закуліссі СДК.

Ігар Гарашчук.

Леў Шылін.

У ДК дзяцей і падлеткаў зацягнуць вельмі цяжка...

ТРАКТАРЫСТ ПА ПРАФЕСІІ...

Дырэктару Сельскага дома культуры Ігару Гарашчуку — з яго знешнасцю — трэба было б узначальваць, як мінімум, элітную службу аховы якога-небудзь алігарха. Але такія людзі, як ён, вельмі патрэбныя нашай культуры — і каб ахоўваць яе, і каб захоўваць ды памнажаць. Чым Ігар Уладзіміравіч і займаецца. І яшчэ ён, на хвілінку, — стараста Шасціснапаў!

Скончыў Гарашчук сельскагаспадарчы ліцэй, мог бы і па гэты дзень працаваць трактарыстам або зваршчыкам, але амаль сем гадоў таму быў прызваны народам ратаваць ДК, які знаходзіўся на той момант не ў лепшым стане. Адмаўляцца і не стаў, паколькі ад прыроды мае схільнасць да здаровага авантурызму. І так паступова гэтая "афера" ператварылася ў сэнс жыцця — чаму ён і сам дасюль не перастае здзіўляцца.

— Каб не людзі, якія ходзяць у Дом культуры і якім ён неабходны, не ведаю, ці затрымаўся б я на такі час на гэтай пасадзе, — шчыра прызнаецца дырэктар. — Мяне ж не ад безвыходнасці і безальтэрнатыўнасці аднавяскоўцы папрасілі падумаць аб гэтай вакансіі, а потым парэкамендавалі маю кандыдатуру на зацвярджэнне раённым уладам. Спачатку я і сам, што называецца, стаў пранікацца народнай культурай, удзельнічаючы ў традыцыйных святах. І землякі мае гэта бачылі. Я спяваць стаў! Хоць раней толькі, можа, мармытаў сабе пад нос нешта, калі раптам мелодыя нейкая прывязалася. А цяпер у нас з жонкай нават дуэт ёсць. Выступаем і дома, і ў нашым райцэнтры Чэрвені.

...І ЛІДАР ПА НАТУРЫ

Праўда, праз гады і гэтага прадстаўнічага мужчыну "накрыла" тое, што адбываецца з фінансаваннем мясцовай культуры, ён стаў задумвацца: а ці не пакінуць "карабель"?

— Надакучыла стукаць у розныя кабінеты і прасіць пра адно і тое ж. А мне ў адказ адно разводзяць рукамі і кажуць: "Ну, вы ж разумееце..." Ды прапануюць "трымацца", — сумна ўсміхаецца Ігар Уладзіміравіч.

Зрэшты, усё яшчэ думае. І спадзяецца. І трымаецца. Трымаецца каранёў, арганізоўваючы, напрыклад, кожны ліпень свята сваёй вёскі, на якое ў 2017-м сабралася амаль семсот чалавек! Гэта значыць, да менш як трохста жыхароў Шасціснапаў далучыліся чатырыста гасцей — а абы куды і абы на што людзі сёння не паедуць. Значыць, ёсць у арганізаванай спадаром Ігарам імпрэзе нейкая асаблівая, аўтэнтычная "разыначка"!

— Вось у ДК дзяцей і падлеткаў зацягнуць вельмі цяжка, — канстатуе дырэктар. — І яно зразумела: школьнікі з Шасціснапаў у Смілавічах вучацца, і хоць гэтае мястэчка ад нас і недалёка, але пакуль малыя прыедуць дадому, пакуль падсілкуюцца, адпачнуць трохі, урокі зробяць — вось і дзень заканчваецца. А на клуб часу ўжо не застаецца, дый і бацькі ў яго ўвечары адпускаюць неахвотна. Але ў святах удзельнічаць — гэта яны "заўсёды, калі ласка"! Неяк атрымліваецца ў нас іх танцам і песням навучыць, хай сабе і ўрыўкамі.

Тыя ж, каму ўжо за дваццаць, але да пенсіі яшчэ далёка, альбо звязваюць сваё жыццё з Мінскам, пераязджаючы ў яго назаўсёды, альбо ездзяць туды на працу. Ім таксама не да культурнага адпачынку. І выходзіць, што творчыя сілы Дома культуры складаюцца, у асноўным, з тых, каму да пенсіі блізка або хто ўжо гэты бар'ер прамінуў.

Нягледзячы на відавочныя цяжкасці, СДК у раённага начальства — на добрым рахунку. За гэта яго "заахвоцілі" матэрыяльна, дзякуючы чаму ва ўстанове за апошнія два гады памянялі вокны, паставілі жалезныя дзверы, зрабілі ўнутранае аздабленне. Аднак нават пры такой "апецы" ўстанова пакуль не выконвае план платных паслуг.

— Нядаўна да нас прыйшла на працу новы мастацкі кіраўнік. І не проста "адбываць нумар", а з цікавымі ідэямі. Мы нават за яе змагаліся, "выкралі" цяпер ужо нашу Ірыну Мікалаеўну Цэван са Смілавіцкага народнага хору. Спадзяюся, з ёй план і пачнем выконваць! — упэўнена заяўляе Ігар Гарашчук.

У завяршэнні размовы з ім, я зноў агледзеў утульны, кампактны Дом культуры з бібліятэчным аддзелам, настолькі невялікім, што і пісаць — пазітыўна ды ў маштабах краіны — мне пра яго не было чаго. А ў маштабе Шасціснапаў ён, вядома, з'яўляецца сякім-такім глытком свежага літаратурнага паветра. І ўжо зусім у фінале дырэктар СДК па маёй пераканаўчай просьбе агучыў памер уласнай заработнай платы, якую ён атрымлівае. Сказаць вам, якая яна? Не скажу...

— І за гэтыя грошы, бывае, даводзіцца затрымлівацца ў Доме культуры да 22 — 23 гадзін вечара. Да ўсяго, нас пастаянна кантралююць розныя службы — ці на сваім мы працоўным месцы? — развітваецца са мной на гэтай аптымістычнай ноце Ігар Уладзіміравіч.

СЛАБАСЦЬ "ПРАЎДАРУБА"

Леў Шылін — былы воін-інтэрнацыяналіст, які прайшоў Афганістан. Сёння ён працуе дарожным рабочым у Нацыянальным аэрапорце "Мінск" і з'яўляецца ўдзельнікам шасціснапскага ансамбля народнай песні "Сваякі" і Смілавіцкага народнага хору. Ён без усялякага пафасу паведамляе, што культура яго натхняе і амалоджвае.

— Ёсць тыя, хто бавіць свой вольны час з чаркай гарэлкі ў руках або за картачнымі гульнямі з такімі ж сябрукамі. А мая "слабасць" зусім іншая — я вельмі спяваць люблю! — прызнаецца ён.

Як і належыць чалавеку вайсковаму, аб прадмеце, які мяне цікавіць, спадар Леў гаворыць без эківокаў. Адпаведна, такі чалавек і быў патрэбны "К" у якасці мясцовага "праўдаруба". "Ды хай са мной пасля... хоць што зробяць за мае словы — і не праз такое даводзілася ў жыцці праходзіць!" — даверліва прамаўляе Леў Сяргеевіч. Ну а раз так, то вось вам, без купюр.

Каментарый Льва ШЫЛІНА:

— Дом культуры праводзіць да васьмі буйных мерапрыемстваў у год. Менавіта з Шасціснапаў у Чэрвеньскім раёне пайшла сучасная традыцыя адзначаць святы вёсак, перакінулася яна і на суседнія раёны. Пры ўсім пры гэтым, вазьму на сябе смеласць заявіць, што, на мой погляд, культура ў гэтых краях збольшага толькі выжывае, а людзі, занятыя ў ёй, вымушаны атрымліваць мізэрныя заробкі. І калі б не асабістыя падворкі, то даўно б з культуры яны кудынебудзь "тузанулі", хоць у гандляры на рынкі.

Але любоў да мастацтва, хараства, спадчыны трымае іх на сваіх месцах. Узяць наш ДК: гэта не яго віна, а такая аб'ектыўная карціна, калі мы на канцэрты за межамі вёскі нярэдка выпраўляемся на ўласных машынах — арганізаваць калектыўны выезд самадзейнасці на аўтобусе для тых, хто кіруе культурай на раёне, часам аказваецца цяжка. Што ўжо казаць пра тое, калі мы частку касцюмаў даношваем за ансамблем, які ў Шасціснапах існаваў да нашага! А ведаеце, колькі гадоў з таго часу прайшло?

■■■

І ўсё ж не хочацца заканчваць гэты матэрыял на ноце сумнай. Так, праблемы, з якімі сутыкаюцца "людзі культуры", вядомыя добра — многім беларускім вёскам у гэтым сэнсе сёння дакладна не пазайздросціш. Але Шасціснапы ад некаторых з іх адрозніваюцца тым, што тут з цяжкасцямі не змірыліся, не склалі рукі. Іх імкнуцца пераадольваць, па максімуме выкарыстоўваючы наяўныя магчымасці. І гэта спрыяе захаванню і развіццю культуры на вёсцы. З такімі людзьмі, як Ігар Гарашчук, Ірына Цэван, Леў Шылін, усё там павінна атрымацца!

К

“Лесвіца ў неба” над Дняпром

Усё было, як у 2013-м, калі я ўпершыню наведаў гэты міжнародны кінафестываль: той жа лютаўскі Дняпро, які за чатыры дні скінуў з сябе ледзяны панцыр, той жа неўтаймоўны, клапатлівы дырэктар штогадовай “Асамблеі на Дняпры” протаіерэй Ігар (Сабко), тая ж гасціннасць і душэўнасць каманды цэнтра праваслаўнай культуры “Лесвіца”, такое ж шырокае кола творцаў — “дзяцей розных народаў”, такая ж моцная праграма фільмаў з розных краін Еўропы, тыя ж перапоўненыя зацікаўленымі гледачамі залы горада Днепр (былы Днепрапятроўск), тая ж урачыстая цырымонія ўзнагароджання...
Толькі гэтым разам, у 2018-м, — мы сталі першымі!

Спецыяльны прыз “За найлепшы сацыяльны фільм” атрымала Галіна Адамовіч за стужку “Нашы дзеці”, другі спецыяльны “За найлепшы этнаграфічны фільм” дастаўся Юрыю Цімафееву за “Агмень” (абодва — вытворчасці “Беларусьфільма”). А першую прэмію “Срэбная лесвіца” атрымаў я за фільм “Пясняр. Сэрцам і думамі” (вытворчасць “Майстэрні Уладзіміра Бокуна” па заказе Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь).

Зрэшты, не толькі пра заслужаную (спадзяюся!) перамогу нашай “зборнай” хацелася б напісаць у гэтых падарожных нататках.

■■■

У мінулыя гады запрашэнне “Лесвіцы” мела фармулёўку: “у Днепрапятроўск”. Цяпер, калі назву горада скарацілі, выглядала б яно неяк смешна: “у Днепр” — як быццам у раку. Таму кіраўнікі абралі такі выраз: “Асамблея на Дняпры”.

Усе фестывальныя дні былі напружанымі. Акрамя штодзённых шасцігадзінных праглядаў — прэс-канферэнцыі, сустрэчы з гледачамі, бізнес-ланчы, экскурсія на выспу Хорціца, дзе ахвотныя кінематаграфісты маглі паўдзельнічаць у казацкіх забавах. Паснедаўшы ў этнаграфічнай хаце баршчом і галушкамі, імчым у Днепр, каб паспець да пачатку праглядаў а 12-й гадзіне дня.

■■■

“Беларусьфільмаўскую” каманду ў складзе Галіны Адамовіч і Юрыя Цімафеева ўзначальваў Юрый Гарулёў — сябра пратаіерэя, сам дырэктар Міжнароднага фестываля “Магніфікат”, які штогод праводзіўся ў Беларусі. Яны — ах, гэтая нецярплівая спешлівая моладзь! — вырашылі ляцець самалётам. У туман іх борт не прынялі аэрапорты ні Дняпра, ні Запарожжа і пасадзілі яго ажно ў Кіеве. Бедакі ўсю ноч — 700 кіламетраў ізноў жа ў тумане! — з хуткасцю 50 — 60 кіламетраў у гадзіну дабіраліся ў Днепр, спазніўшыся, вядома ж, на адкрыццё Асамблеі і першыя прагляды. Калі сустрэліся, я параіў Гарулёву ў далейшым слухацца старэйшых, бо сам з камфортам ехаў цягнікам.

Прыбыўшы загадзя, меў час на знаёмства з культурным жыццём горада: наведаў мясцовую карцінную галерэю і паглядзеў у Рускім тэатры драмы і камедыі (былы імя Горкага) два спектаклі.

■■■

У музеі акрамя карцін украінскіх мастакоў нядрэнна прадстаўлены і рускі жывапіс — па аднымдва творы Баравікоўскага, Шышкіна, Левітана, Айвазоўскага, Каровіна, Рэпіна, Сярова, Макоўскага.

Цікавая завядзёнка: на пару тыдняў музейшчыкі выстаўляюць нейкі твор з запаснікаў і вакол гэтага разгортваюць спецыяльна падрыхтаваную імпрэзу, так званы перформанс. Я трапіў на паказ “Партрэта дачкі Таты” Зінаіды Серабраковай. Паколькі дзяўчынка выяўлена там на фоне навагодняй ялінкі, выставілі карціну своечасова: акурат у студзені. Яна выканана ў тэхніцы пастэлі, якая не любіць святло, таму партрэт увесь час закрыты тканінай, і прыўздымаюць яе толькі для кароткай дэманстрацыі. А побач сядзіць сапраўдная дзяўчынка ў такім жа адзенні, як на карціне. Быццам пазіруе мастачцы.

Час, цуд, кіно

Ад чаго было сумнавата: у музеі холадна і цёмна. Святло ўключалася толькі ў той зале, у якую ўваходзіў я — адзіны на той час наведвальнік. А потым згасала за маёю спінай. Эканомія электраэнергіі.

■■■

Тое ж і ў тэатры. Вешалкі пустыя, дзве гардэробшчыцы сядзяць у куртках і шапках. Дасведчаныя гледачы ў той бок фае нават не заходзяць — адразу ў вопратцы рушаць у глядзельную залу.

А спектаклі спадабаліся! Мо таму абодва вечары тэатр быў запоўнены.

“Дзікуна” Аляксандра Касона граюць у тэатры ўжо чатыры гады, але спектакль не “развальваецца”, акцёрскі склад зладжаны, шмат маладых прыгожых выканаўцаў. Іх пераважна рыхтуе мясцовая тэатральная вучэльня.

“Дзіўнаватая місіс Сэвідж”... Спектакль — сенсацыя! Я трапіў на бенефіс народнай артысткі Украіны Людмілы Вяршынінай. Бенефіс — з нагоды яе... 90-годдзя! Дзве з паловай гадзіны артыстка не сыходзіць са сцэны, агучваючы шматстаронкавы тэкст. Даведаўся, што яна “цягне” яшчэ тры спектаклі: пастаўленыя, як кажуць, “на яе”.

■■■

З айцом Ігарам знаёмы, мо, гадоў дзесяць: ён удзельнічаў ва ўсіх нашых “Магніфікатах”, прывозіў як уласныя фільмы, так і стужкі іншых украінскіх кінематаграфістаў.

У 2013-м па яго запрашэнні як госць быў на Асамблеі ў Днепрапятроўску. У 2014-м паехаць туды не выпала, але Гарулёў прывёз мне вялікую размаляваную талерку з дрэва — спецыяльны прыз за фільм “І аб нечым іншым” (вытворчасць “Чырвоны касцёл”). Трэцюю прэмію “Бронзавая лесвіца” за фільм “Фатаграфіі, што змянілі свет” (вытворчасць “Майстэрня Уладзіміра Бокуна”) летась мне перадалі праз амбасаду Украіны.

■■■

Прэм’ера фільма “Пясняр. Сэрцам і думамі” адбылася 26 студзеня — у дзень 15-годдзя адлёту Уладзіміра Мулявіна ў Вечнасць. Нібы сышлі з экрана ў залу дачка славутага “песняра” Марына і знакамітыя музыканты гурта. Пасля мы памянулі “Мулю”, з Ігарам Місевічам узгадалі здымкі майго першага фільма “Песняры” ў другім павільёне “Беларусьфільма” ў студзені 1971 года. І тады мне падумалася: “Самае патаемнае, чаму людзі знайшлі назву — Час. Самы вялікі цуд — кіно, якое робіць тых, хто даўно адышоў, “вечна жывымі”.

■■■

У Дняпры “Песняром” адкрывалі апошні дзень прагляду, і адбываўся ён таксама ў філармоніі — як і ў Мінску. Гледачы загадзя, яшчэ за палову гадзіны, займалі месцы ў зале.

Віншаванні і падзякі за фільм прымаў ужо на выхадзе з яе. Прагляды і ўзнагароджванне — без перапынку — доўжыліся гадзін шэсць. Я дзівіўся: “Няўжо выседзелі такую працоўную змену?”

— Яшчэ як! — запэўнілі мяне. — Асамблея для нас — гэта сапраўдная з’ява! Мы чакаем яе штогод.

На ўрачыстасці з нагоды пяцігоддзя тэлеканалу “Беларусь-3” я пачуў, што на працягу дня яго перадачы глядзіць больш за мільён гледачоў. Значыцца, фільм “Пясняр. Сэрцам і думамі” там убачылі як мінімум некалькі дзясяткаў тысяч.

Рады, што да гэтай колькасці дадаліся яшчэ 420 жыхароў Украіны, якія віталі беларускую стужку ў Дняпры.

Пераможцы Міжнароднага фестывалю дакументальных фільмаў "Кінаасамблея на Дняпры-2018" (Уладзімір Арлоў — апошні справа).

■■■

На сёлетняй Асамблеі фільмы, акрамя Украіны і Беларусі, прадставілі Сербія, Азербайджан, Польшча, Расія. Прызнаюся, увесь рэпертуар не адгледзеў: нешта здалося занудлівым, і я выходзіў з залы “на гарбату”. З некалькіх праглядаў зрываўся дзеля тэатра.

Але шэраг убачаных фільмаў уразіў. І асабліва два з іх: “Бомбы, якія ўзарвалі свет” і “На мяжы розуму”. У абодвух — вайна, смерць, гора, руйнаванні, скамечаныя чалавечыя лёсы.

Першы атрымаў Гран-пры “Залатую лесвіцу” (аўтар Антон Нікіцін, тэлеканал “Інтэр” — Украіна). Ён пра цяперашнюю вайну ў Сірыі. Здаецца, што кіяўлянам да Алепа ды Дамаска? Але “чужога гора не бывае”, як і “чужой” вайны.

Другі фільм — з Рэспублікі Сербскай — атрымаў спецыяльны прыз. Ён пра рану, якая ў сербаў, пэўна, ніколі не загоіцца: пра падзел Югаславіі, пра натаўскія бамбардзіроўкі і зняволенне прэзідэнта Слабадана Мілошавіча. Выказваліся ў фільме прадстаўнікі абодвух бакоў: і сербы, і албанцы — у кожнага свая праўда. Але вынік відавочны: вайна нікога не робіць шчаслівым. Дзіўна было, што рэжысёр такой стужкі — вытанчаная прыгожая жанчына Мілана Маяр. І добрая якасць: расповед пра трагедыю народа ўклаўся ў 26 хвілін хронаметражу.

На жаль, гэтага не здолелі зрабіць стваральнікі некаторых іншых фільмаў. Не ва ўсіх былі лаканічныя, адабраныя стваральнікамі выказванні персанажаў. “Гаваркія галовы” шматслоўна бубнілі тое, што глядач ужо даўно зразумеў.

Такім жа “спружыненым”, тэмпавым, як наш “Пясняр”, падаўся фільм азербайджанкі Арзу Уршан “Тройка на ўсе часы” — пра славутых хакеістаў Харламава, Пятрова і Міхайлава.

Як у “Песняры” скразной дэталлю стаў пясочны гадзіннік, у якім пясок сыпаўся знізу ўверх — “час назад!”, так і ў паляка беларускага паходжання Ежы Каліны ў фільме “Бежанцы” гэткім сімвалам стаў куфар. Гераіня вымае адтуль дакументы яе сям’і, распавядаючы гісторыю роду, выселенага ў Першую сусветную з Гарадзеншчыны ажно ў Саратаў. Каліна атрымаў прыз “За найлепшы гістарычны фільм”.

■■■

Адваротны транспарт абраў я таксама наземны: той жа цягнік “Мінск — Запарожжа”. Таму меў час прааналізаваць, так бы мовіць, складнікі поспеху.

Канешне, тэма. “Пясняр” выторкваўся сярод драм, жудасці, трагедый — хаця б усім вядомай музыкай.

Канешне, асоба Уладзіміра Мулявіна — улюбёнца ўсіх народаў неабсяжнага СССР, якога памятаюць і дасюль.

Канешне, інтэрв’ю — вельмі кароткія, ёмістыя, “перакрытыя” цікавым, пераважна раней невядомым відэаматэрыялам.

Канешне, камп’ютарная апрацоўка відэа: хронікі, фотаздымкаў. Я лічу гэта “школай Бокуна” — стыль адточваўся і дасканаліўся ў чатырох сотнях фільмаў цыкла “Зваротны адлік”. На жаль, ні ў адной з убачаных мною падчас Асамблеі стужак гэтых сучасных прафесійных прыёмаў не было.

Атрымаў запрашэнне на 10-ю “Асамблею на Дняпры-2019”. Трэба рыхтавацца.

Уладзімір АРЛОЎ,
сцэнарыст і рэжысёр

Па куплеце ўсяму свету

Анжаліка Ют на розных планетах шоу-бізнесу

Будучы яшчэ з канца 1990-х хоць і шапачна знаёмым з гэтай чароўнай спявачкай, якая валодае фантастычным па прыгажосці і моцы голасам, не раз адзначаў яе заўсёдную засяроджанасць, сур'ёзнасць, грунтоўнасць. Як вы ўбачыце са змешчанага ніжэй інтэрв'ю, гады характар Анжалікі ЮТ ані не змянілі. Як мала памянялася і знешнасць артысткі — усё гэтак жа захапляе.

Алег КЛІМАЎ

Даведка

Анжаліка ЮТ (сцэнічнае імя Анжаліка, Angelika), нарадзілася ў Сімферопалі. Скончыла Сімферопальскую музычную вучэльню. У пачатку 1990-х — салістка Крымскага ўкраінскага тэатра драмы і музычнай камедыі, былая вакалістка студыі "Ласкавы май", ВІА "Чараўніцы", Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі, ансамбля "Сябры", гурта "Анжаліка", Прадзюсарскага цэнтра Ігара Селіверстава. Салістка аўстрыйскага лэйбла Millennium Opera, кампазітар, вакальны трэнер, прадзюсар, член Прафесійнага саюза пісьменнікаў Расіі.

ПОБАЧ З ГЭРЫ МУРАМ

— "Складвацца" як артыстка Анжаліка Ют пачала ў Беларусі. З вашым з'яўленнем на нашай эстрадзе нібы адкрылася новае дыханне — свежае, сучаснае па тых часах…

— Усё ж, "складвацца" я пачала ў Сімферопалі, дзе была прымай тэатра музкамедыі, і ў Маскве, у студыі "Ласкавы май", дзе мы працавалі на канцэртах разам альбо з Юрам Шатуновым, альбо з Аляксандрам Сяровым. Пераехаўшы жыць у 1992 годзе ў Беларусь, я апынулася ў новых умовах, сярод новых людзей і ў новай для сябе абстаноўцы. Мне вельмі падабалася музычная атмасфера Мінска таго часу. У аркестры Міхаіла Якаўлевіча Фінберга, як мне здаецца, сабраліся найлепшыя ў краіне музыканты і вакалісты. Менавіта працуючы ў гэтым калектыве, я заваявала Першую прэмію Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі "Маладзечна-93" і стала дыпламантам Міжнароднага конкурсу "Вільнюс-93".

— Але што вас перастала задавальняць у нашым шоу-бізнесе ды прымусіла з'ехаць у Маскву?

— У Беларусі мне было "зацесна", і мяне ўвесь час цягнула назад у Маскву. Ды і "зламалася" нешта ў беларускім шоу-бізе. У канцы 1990-х была напісаная новая праграма, пачаліся перамовы з маскоўскімі прадзюсарамі. Праектам зацікавіўся небезвядомы Ігар Селіверстаў, і мы, як праект "Анжаліка", пераехалі ў Маскву. Я сустрэлася з Сашам Сяровым, у нас зноў пачаліся сумесныя канцэрты.

— Ці моцна расійская музычная індустрыя адрозніваецца ад беларускай?

— Гэта дзве розныя планеты. Там зусім іншыя рытм жыцця і кантрактныя абавязацельствы, непараўнальныя адлегласці перасоўванняў. Усё больш жорстка, людзі больш закрытыя. Працуючы з Селіверставым, я ў пэўны момант нават адчувала настальгію па маім любімым аркестры Фінберга, па той атмасферы, што панавала там у пачатку 1990-х. Неяк я нават прыязджала ў Мінск да Міхаіла Якаўлевіча і спрабавала сумяшчаць супрацоўніцтва з аркестрам і канцэрты ў Маскве. Але аб'ём работы ў Расіі нарастаў, мне даводзілася практычна жыць у цягніках і самалётах. Давялося зрабіць канчатковы выбар на карысць Масквы.

— Далёкае замежжа заўсёды шанавала самабытныя галасы. І гэта акурат тое, што ёсць у вас — каларатурнае сапрана. Наколькі я разумею, была спроба зрабіць кар'еру ў Заходняй Еўропе, аднак пакуль усё абмяжоўваецца тым, што час ад часу там выдаюцца вашыя рэлізы, нейкія песні трапляюць у чарты. Але магутнага тамтэйшага прадзюсавання вы не атрымалі.

— Калі скончыўся кантракт з Селіверставым, мы пачалі развіваць зусім іншы праект, арыентаваны не на вузкарасійскую, а на сусветную аўдыторыю. Спачатку з'явіліся вакальныя версіі вядомых класічных твораў у клубных міксах — Саракавая сімфонія Моцарта, "Танец маленькіх лебедзяў" Чайкоўскага, "Салавей" Аляб'ева. Калі гэта "пакаціла" на Захадзе, сталі пісаць арыгінальныя трэкі, дзе маё каларатурнае сапрана ўпляталася ў напрамкі trance і chill. Яны сталі падымацца на першыя пазіцыі сусветных чартаў (iTunes, Juno, Beatport) і "круціцца" на радыёстанцыях па ўсім свеце. Адразу пяць маіх трэкаў увайшлі ў культавы зборнік New Age Style — New Opera нароўні з кампазіцыямі такіх артыстак, як Эма Шаплін, Лара Фабіян, Сара Брайтман... Пачынаючы з 2011 года мае новыя рэлізы (у тым ліку і ў супрацоўніцтве з вядомымі заходнімі ды-джэямі) выходзяць рэгулярна. Бліжэйшыя, напрыклад, — 2 сакавіка — Fata Morgana на лэйбле Mondo Records у Лондане, і 6 сакавіка — In My Dreams на аўстрыйскім GlobalsounD Production.

Але асабліва папулярным апынуўся, на здзіўленне, Гімн Расіі ў маім выкананні. У яго мільёны праглядаў у інтэрнэце, вось ужо больш за паўгода ён увесь час уваходзіць у першую пяцёрку Top 100 iTunes Blues Chart Russia, перыядычна падымаючыся на першае месца. Побач — Гэры Мур с Still Got the Blues, Рэй Чарльз з Hit the Road Jack. Пагадзіцеся, нядрэнная кампанія!

Што ж тычыцца канцэртнай дзейнасці, то ў канцы сакавіка зноў плануюцца гастролі ў Германіі. Аднак цалкам пераязджаць на Захад і рабіць там кар'еру планаў няма: у мяне хапае працы і ў Маскве.

— Оперныя спевакі Муслім Магамаеў і Мікалай Баскаў аддалі перавагу эстрадзе. Вы ніколі не хацелі, будучы ўжо поп-спявачкай, цалкам сысці ў оперу?

— Я пачынала з аперэты, потым пайшла на эстраду, затым — у клубную музыку. Але ў выніку зразумела, што ў адным жанры мне зацесна. Я займаюся тым, што мне цікава, а не тым, што мне навязваюць. Менавіта з гэтай прычыны жорсткіх кантрактаў з прадзюсарамі больш не падпісваю.

ПРА КАРЫСЦЬ ГУЗАКОЎ

— Абываццель скажа: ну так, нешта памятаю пра Ют. Скажам, песню "Мама-Маруся" — перапеў трэка Mamma Maria італьянскага трыа Ricchi e Poveri. А чаму той спявачкі няма "ў тэлевізары" або на радыё сёння?

— Мы пра беларускага абываццеля гаворым?

— Вядома.

— Дык ён і глядзіць толькі беларускае ТБ і слухае толькі беларускае радыё. А вось сябры з розных краін дасылаюць мне спасылкі на ратацыі маіх песень, напрыклад, у Італіі, Мексіцы, Грэцыі, Бразіліі. Кліп на Egyptian Love папулярны ў арабскіх краінах, а рускамоўны "Прощай" круцілі на некаторых тэлеканалах ЗША, Эстоніі, Германіі і Аўстрыі. Нешта выкладваю спасылкамі або анонсамі на сваіх старонках у сацсетках. Але адсачыць усе мае ратацыі па свеце проста нерэальна (да прыкладу, кампазіцыя Fantasia del Amor, вельмі папулярная ў Лацінскай Амерыцы, была спецыяльна запісаная па просьбе маіх мексіканскіх сяброў менавіта для тамтэйшай публікі і праспяваная на іспанскай мове). І тое, што "круцяць" заходнія станцыі і тэлеканалы — гэта, ужо выбачайце, не той фармат, які распаўсюджаны ў Беларусі. Нават самыя папулярныя мае trance- і chill-трэкі будуць, мякка кажучы, моцна выбівацца з беларускага радыёфармату.

Песні ж на рускай я апошнім часам запісваю нячаста. Але, дарэчы, "Зоркі", як мне перадавалі, у Мінску па радыё чулі шмат разоў. Кажуць, што "круцяць" і яшчэ нешта.

— А што наогул сёння адбываецца ў вашым творчым жыцці?

— Запісваю новыя песні, развіваю сваю вакальную школу. Вакалісты, якіх я навучаю, жывуць не толькі ў Маскве, а і ў розных гарадах Расіі. Некаторыя з іх дасягаюць рэальных вяршыняў, перамагаюць у вакальных конкурсах, скараюць заходнія чарты. Напрыклад, Паліна Клінквурт, якую Амерыканская музычная акадэмія сёлета намініравала на прэмію Artist of the Year 2017. Ёсць вучні ў Францыі, Ізраілі, ЗША, Тайландзе.

— І чаму б тады не адкрыць філіял школы, скажам, у беларускай сталіцы?

— Калі ў тым будзе чыясьці рэальная зацікаўленасць, то можна пралічыць рэнтабельнасць (маральную і матэрыяльную), абмеркаваць пытанне канкрэтна. Але толькі калі ўсё рабіць па-сур'ёзнаму, падарасламу. Гуляцца ў цацкі мне ўжо даўно не цікава.

— Кажучы "мы", вы пад гэтым займеннікам маеце на ўвазе сябе і Уладзіміра Станкевіча — у першую чаргу вядомаму "абываццелю" па ролі Дзяніскі Кораблёва ў кінастужцы "Па сакрэце ўсяму свету" студыі "Беларусьфільм", а потым ужо як стваральніка ды ўдзельніка музычных праектаў Elegant Company і "Анжаліка"? Ён жа стаў не толькі вашым прадзюсарам, але і мужам.

— Мы пазнаёміліся на адным з маіх першых у Беларусі зборных канцэртаў — у Дзяржынску. Ён там быў вядучым. Першае ўражанне — гнюсны тып! Але калі я выйшла замуж за гэтага чалавека, значыць, яно аказалася памылковым. Значыць, у яго тады была нагода для жорсткага сцёбу артыстаў (мяне, дарэчы, гэта не тычылася). Некалькі месяцаў таму мы адзначылі 20 гадоў з дня афіцыйнага роспісу ў ЗАГСе!

— Напэўна, правільным будзе назваць адзін з кірункаў, у якім вы працуеце, красоверам, сінтэзам некалькіх жанраў. А чаго ў Анжаліцы Ют намяшана як у чалавеку?

— У любым з нас шмат чаго панамешвана. Але вельмі часта чалавек да канца не ведае, якія неверагодныя магчымасці хаваюцца ў яго ўнутры, што і калі "стрэліць". Я вельмі шматгранная. Настолькі, што часам сама ад сябе не чакаю нейкіх дзеянняў і ўчынкаў. Магу быць і рахманай, ранімай дзяўчынкай, а магу — жорсткай і непахіснай.

— Ці было на вашым творчым шляху нешта такое, што вы зрабілі не так? Ад чаго, быць можа, хацелі б перасцерагчы выканаўцаў-пачаткоўцаў?

— Ні пра што не шкадую! Набітыя гузакі — жыццёвы вопыт. Пушкін правільна напісаў: "І досвед, сын памылак цяжкіх". Магу толькі параіць ніколі не пасаваць перад складанасцямі, заўсёды лезці напралом. І не прагінацца ні перад кім, захоўваць уласную індывідуальнасць. Бо менавіта індывідуальнасцю, у першую чаргу, і каштоўны артыст.

К

Цікавей за прыгодніцкі серыял

(Працяг. Пачатак у № 6.)

4 лютага 1809 года, падчас руска-шведскай вайны, вядомай таксама як Фінляндская вайна, галоўнакамандуючы фінляндскай арміяй генерал ад інфантэрыі Багдан Кнорынг прапанаваў марскому міністру Расійскай імперыі адміралу Паўлу Чычагаву кандыдатуру кіраўніка пабудовы флатыліі ў горадзе Улеаборгу. Ім меўся стаць капітан-лейтэнант Ігнат Марцінкевіч, "от ревности которого должно равномерно ожидать совершенных успехов". Да таго часу брат нашага класіка ўжо праявіў сябе ў бітвах і паходах, меў узнагароды і аўтарытэт. Таму на яго і ўсклалі пачэсную ды адказную місію.

БУРА

Кананерскія лодкі — гэта своеасаблівы аналаг сучасных катараў. Невялічкія парусна-веславыя судны мелі па некалькі гармат. Расійскай імперыі на той час яны былі моцна патрэбныя — як для ўтрымання толькі што заваяваных фінскіх земляў, так і на выпадак буйнамаштабнай вайны з Напалеонам, чые амбіцыі несупынна раслі.

Усяго ў "нованабытай Фінляндыі" расійскі ўрад планаваў пабудаваць 58 кананірскіх лодак коштам 406 тысяч рублёў асігнацыямі. З гэтай сумы на долю Ігната выпала 84 тысячы рублёў, якіх павінна было хапіць на пабудову 18 лодак. Тэрмін выканання вызначылі даволі сціслы — да 1 жніўня 1809 года.

Ігнат Марцінкевіч без прамаруджвання правёў "разведку на мясцовасці", даведаўся, дзе знаходзяцца верфі, дзе можна нарыхтаваць карабельны лес, а дзе наняць неабходных майстроў. 18 ліпеня ён адрапартаваў, што ім пабудаваны: "5 лодак улаборскіх, 5 тарнейскіх, 1 шведская, дэсантнае і яшчэ транспартнае малое судна", але для іх патрэбны такелаж і ветразі. Таксама адсутнічалі і карабельныя каманды, хаця паводле рапартаў яны даўно былі на месцы.

12 верасня Марцінкевіч напісаў Чычагаву, што пабудаваў не толькі ўсе замоўленыя лодкі, але нават і незапланаваныя — што, натуральна, запатрабавала дадатковых выдаткаў. Акрамя таго, грошы былі неабходныя і на закупку прадуктаў, дастаўку ўзбраення, а таксама на заробак камандам. У выніку, Ігнат атрымаў агулам 176 450 рублёў. Аднак неўзабаве адбылася падзея, якая сур'ёзна паўплывала на яго будучыню.

Неўзабаве пасля пабудовы улеаборгская флатылія, якая складалася з 17-ці кананірскіх лодак, правіянцкага і дэсантнага судна, была пастаўленая на зімоўку ў бяспечным месцы, закрытым з усіх бакоў ад вятроў. 27 кастрычніка раптам узняўся моцны вецер, які спараджаў хвалі вышынёю ажно ў 8 сажань.

У сваім рапарце Ігнат Марцінкевіч пісаў: "Тыя астравы, якія былі абароненыя, пакрыліся вадой і лёдам, нанесенымі з морам. Праз гэтыя выспы панесла лёд і прыбіла да судоў". Карабельныя канаты рваліся адзін за адным. Кананірскія лодкі пачалі дрэйфаваць, напорваючыся на камяні і атрымліваючы пашкоджанні.

Аляксей Багалюбаў. "Рэвельскі бой 2 мая 1790 года". Удзел у ім прымаў і малады мічман Ігнат Марцінкевіч, які тады служыў на 66-гарматным караблі "Ізяслаў" .

Па словах Марцінкевіча, вынік стыхійнага бедства для флатыліі быў катастрафічны: уся яна патанула, як і многія гандлёвыя суды. "Ніхто з жыхароў не прыгадвае такой паводкі", — піша ён.

КУДЫ ПАДЗЕЛІСЯ ГРОШЫ?

Праўда, датклівыя царскія чыноўнікі эмацыйнаму рапарту Марцінкевіча не паверылі ды распачалі ўласнае даследаванне. У чыесьці галовы ўжо тады, пэўна, закралася думка: а што калі афіцэр выкарыстоўвае навалу як сродак схаваць уласнае махлярства?

І сапраўды, допыт сведак той павадкі выявіў зусім іншую, не такую драматычную карціну: "У рапарце Мартынкевіча паказана, што ўсё, што стаялі на стапелях суда, былі патоплены вадою, пра што пыталіся пры грамадзянскім чыноўніку жыхароў той выспы, якія сцвярджаюць, што паводка распасціралася ля берагу не больш за 6-ці сажань, судны ж пастаўленыя на стапелях у дзве лініі, з якіх паводкай захоплівала толькі да паловы судоў першай лініі, другая ж палова заставалася на сушы, што ж тычыцца другой лініі, то да гэтай вада не даходзіла, а таму ў дзень гэты суды і не маглі быць патопленыя".

Што ж адбылося насамрэч 27 кастрычніка 1809 года, сказаць цяжка. Як і пра лёс тых кананірскіх лодак, што быццам былі патоплены. Як адзначылі следчыя, Марцінкевіч атрымаў ад камандзіра Свеаборгскай крэпасці прадпісанне "ўсе пашкоджанні і страты агледзець і неадкладна прыступіць да выпраўлення судоў. Пра суму страт адрапартаваць. Што было зроблена ім вельмі павярхоўна".

Кіраўніцтва дарэмна чакала да канца 1809 года падрабязнай справаздачы аб тым, куды сышла немалая сума грошай. А ў пачатку 1810 года, калі Марцінкевіч ужо быў адхілены ад сваіх абавязкаў, у марское кіраўніцтва пачалі прыходзіць скаргі ад мясцовых уладаў аб стратах, нанесеных Ігнатам: ён рабіў пазыкі і не вяртаў, не аплачваў набытыя прадукты і матэрыялы, не плаціў заробак...

Справаздачу Ігнат прадставіў толькі ў сакавіку, калі ўжо працавала следчая камісія. Сумы ў іх фігуруюць па тых часах папраўдзе касмічныя. З правераных следчымі ведамасцяў вынікае, што Марцінкевічу "адпушчана было 173 675 рублёў 36 капеек і ім самім было занята без данясення начальству ў розных партыкулярных людзей і Улеабургскага казначэйства 101 952 рублі 12 капеек, усяго ж 275 627 рублёў 48 капеек, з якіх у справаздачах паказаны 269 785 рублёў 39 капеек. Звыш таго, забраны ім лес і матэрыялы ў розных прадаўцоў на 67 339 рублёў 27 капеек".

Пра матывы, якімі кіраваўся Ігнат Марцінкевіч, мы пакуль нічога не ведаем. Ці быў ён такім ужо нядбайным і нядобрасумленным? Ці сапраўды краў дзяржаўныя грошы — і куды іх у такім разе падзеў? Адказаў на гэтыя пытанні пакуль няма.

Але можна меркаваць, што дыму без агню не бывае. Агулам матэрыялы следства займаюць болей за тысячу аркушаў. Датклівыя сышчыкі праводзілі допыты, карпатліва правяралі бухгалтэрыю, адсочваючы лёс кожнай дзяржаўнай капейчыны. У выніку, удалося ўстанавіць, што большую частку грошай Марцінкевіч усё ж патраціў на справу. Аднак і недалік склаў прыстойную суму.

ВЫРАК — РАССТРАЛЯЦЬ!

Прысуд, вынесены 25 красавіка, вылучаўся безапеляцыйнай жорсткасцю: "Падсудны капітан-лейтэнант Мартынкевіч (у Расіі гэтае прозвішча часцей пісалі праз літару "т", а не "ц", і менавіта варыянт "Мартынкевич" чытаецца ў асабістым подпісы Ігната — **З.Д.**) знаходзіўся на службе пасля выпуску з гардэмарынаў Марскога кадэцкага корпуса ў мічманы ў 1788 годзе, у цяперашнім званні з 1804 года, з двараН польскай нацыі, 40 гадоў, сялян не мае, у кампаніях і бітвах удзельнічаў, мае ордэн св. Георгія 4 ступені і св. Уладзіміра 4 ступені з бантам. Ваенны суд па абставінах справы гэтай Мартынкевіча вінаватым знаходзіць і прысуджае да спагнання з яго на карысць казны і на пазыкоўцаў задавальненне 19 283 рублі 56 капеек, пазбавіўшы яго ордэна і адабраўшы афіцэрскія чыны, патэнты, яго расстраляць".

Сам Ігнат у гэты час знаходзіўся пад арыштам на гаўптвахце ў горадзе Свеаборгу. Пасля вынясення прысуду ў яго заставалася апошняя надзея — на апеляцыю. Марцінкевіч спрабаваў апраўдацца: "Калі і здарыўся які недагляд па маёй службе, то гэта было зроблена не з намерам, але толькі дбаючы, каб аказаць паслугу майму Гасудару, а асабліва ў такіх крытычных ваенных абставінах". Акрамя таго, спасылаючыся на сваё дрэннае здароўе, Ігнат прасіў перавесці яго ў Санкт-Пецярбург.

Цэлы месяц ён правёў паміж жыццём і смерцю. 24 мая найвышэйшая судова-крымінальная інстанцыя ваеннага ведамства — Генерал-аўдытарыят — пастанавіла: пазбавіўшы Марцінкевіча ўсіх чыноў і ордэнаў, запісаць у матросы з аддачай усіх даўгоў. Але галоўнае ён захаваў жыццё! А 19 283 рублі 56 капеек (між іншым, кошт добрага маёнтка!) — справа нажыўная.

І сапраўды, паколькі прэтэнзій да яго болей не было, можна меркаваць, што Ігнат Марцінкевіч разлічыўся. Магчыма, дапамог яму ў гэтым уплывовы і заможны дзядзька — мітрапаліт Станіслаў Богуш-Сестранцэвіч.

Зміцер ДРОЗД,
гісторык, архівіст

Працяг —
у наступных нумарах "К".

Ён быў сынам свайго часу

13 лютага адзначаліся 100-я ўгодкі з дня нараджэння Пятра Машэрава. Легендарны партызанскі камандзір Дубняк, які адразу пасля вызвалення Беларусі стаў Героем Савецкага Саюза, прыкладаў усе намаганні для паваеннага аднаўлення свайго роднага краю і дасягнуў заслужаных кар'ерных поспехаў. Машэраў узначальваў Камуністычную партыю Беларусі з 30 сакавіка 1965 года і да свайго раптоўнага сыходу з жыцця, які здарыўся 4 кастрычніка 1980 года. З пазіцыі сённяшняга дня набыткі таго часу ўжо не падаюцца такімі пераканаўчымі. Таму стаўленне даследчыкаў да "эпохі Машэрава" супярэчлівае.
Аднак...

Заір Азгур быў земляком Машэрава: абодва родам з Сенненшчыны.

На сустрэчы з баявымі сябрамі. Фота Юрыя ІВАНОВА

ПА КНІЗЕ НА КОЖНАГА

Тэлеканалаў у тыя часы было ўсяго некалькі. Адзін з іх — Другі агульнасаюзны. І можна было сабе ўявіць, як здзівіліся гледачы, націснуўшы на знаёмую кнопку — і ўбачыўшы на гэтых хвалях не нуднаватыя рускамоўныя перадачы, а праграмы, зробленыя ў Мінску, прычым на мове Купалы і Коласа. Ініцыятарам такой замены стаў менавіта Машэраў. І менавіта ён асабіста запрасіў узначаліць Беларускае тэлебачанне паэта Генадзя Бураўкіна.

Вялікі рэзананс мела і выданне першай універсальнай энцыклапедыі на беларускай мове ў 12 тамах, а таксама грунтоўных слоўнікаў. Запрацавалі выдавецтвы "Мастацкая літаратура" і "Юнацтва", з'явіўся новы літаратурны часопіс "Маладосць".

Наклад беларускамоўных часопісаў і кніг, як сведчыць статыстыка, рос літаральна на дражджах! У сваёй публікацыі "Машэраў, які будаваў Беларусь у ценю Масквы" айчынны палітолаг Сяргей Богдан прыводзіць папраўдзе ашаламляльныя лічбы. З іх вынікае, што на сярэднестатыстычнага жыхара рэспублікі ў 1980 годзе прыпадала тры нумары беларускамоўных часопісаў і амаль адна кніга!

ПАРАД ДАСЯГНЕННЯЎ

У часы праўлення Машэрава ў сталіцы БССР адна за адной адкрываліся знакавыя ўстановы культуры — Дом літаратара, філармонія, Палац мастацтва. Узрасла колькасць тэатраў, значна палепшыўся іх рэпертуар, умацавалася супрацоўніцтва з беларускімі драматургамі.



У Палацы мастацтва з народным мастаком Літвы Стасісам Красаўскасам і алімпійскім чэмпіёнам Аляксандрам Мядзведзем падчас Дэкады літоўскай культуры ў 1974 годзе. Фота з архіва Барыса КРЭПАКА

Тое самае адбывалася і ва ўсёй рэспубліцы — паўсюдна будаваліся новыя палацы і дамы культуры, бібліятэкі... Разам з тым, як слушна адзначае прафесар, доктар гістарычных навук Уладзімір Навіцкі, формы работы многіх з іх "адставалі ад запатрабаванасцяў часу, агульнаадукацыйнага ўзроўню людзей".

Адбылася змена пакаленняў у інжынераў чалавечых душ. На першы план у пісьменніцкім цэху выйшлі "шасцідзясятнікі": Васіль Быкаў, Уладзімір Караткевіч, Андрэй Макаёнак, Іван Навуменка, Іван Шамякін, Іван Мележ, Рыгор Барадулін, Ніл Гілевіч. Іх прызнанне ў тыя часы таксама было ўсесаюзным. Прыкладам, Быкаў атрымаў Дзяржаўную прэмію СССР за аповесці "Абеліск" і "Дажыць да світання". А яго старэйшыя калегі Пятрусь Броўка, Максім Танк, Кандрат Крапіва сталі Героямі Сацыялістычнай Працы.

На якасна новы ўзровень узнялася беларускае кінамастацтва. У 1968 годзе на кінастудыі "Беларусьфільм" было створана аб'яднанне тэлевізійных, а праз сем год і мультыплікацыйных фільмаў. Стужкі, знятыя ў БССР, карысталіся попытам у саюзным пракаце, а тры з іх — "Генерал Пушча", "Паланэз Агінскага", "Дзяўчынка шукае бацьку" — атрымалі Дзяржаўную прэмію СССР.

Першы сакратар ЦК КПБ быў ініцыятарам будаўніцтва чатырох вялікіх мемарыялаў, для кожнага з якіх удалося знайсці выдатныя архітэктурна-мастацкія рашэнні: Хатынь, Курган Славы, "Брэсцкая крэпасць-герой" і "Прарыў". Да таго ж, менавіта пры Машэраве ў Мінску былі ўсталяваныя помнікі Янку Купалу і Якубу Коласу, якія сталі сапраўднымі ўзорамі беларускай манументалістыкі.

Але тут парад дасягненняў у духу справаздач таго часу варта перапыніць. Сёння мала хто аспрэчыць відавочнае: многія рашэнні Машэрава ў сферы архітэктуры былі памылковымі. Першае, што прыгадваецца, — знос знакамітай мінскай Нямігі.

З ВЕРТАЛЁТА — НА ПРЭМ'ЕРУ

Са многімі выбітнымі дзеячамі культуры таго часу ў Машэрава склаліся прыязныя асабістыя адносіны. Ён у ахвоту сустракаўся з імі як у рамках афіцыйных мерапрыемстваў, так і ў нефармальнай абстаноўцы. Вельмі дарэчы прывесці тут сведчанне жонкі першага сакратара Паліны Андрэеўны: "Пётр Міронавіч глыбока паважаў творчую інтэлігенцыю, высока цаніў талент і адданасць справе. Ён асабіста ведаў многіх пісьменнікаў, артыстаў, мастакоў, архітэктараў, журналістаў. Здаралася, прыляціць верталётам у Мінск стомлены, толькі дабярэцца дахаты, а тут званок: сёння ў тэатры прэм'ера спектакля па п'есе Андрэя Макаёнка. Не мог ён адмовіцца ад запрашэння. Хутка апраналіся — і ў тэатр. А потым, нягледзячы на стомленасць, абмяркоўваў п'есу, майстэрства артыстаў".

Таму і нядзіўна, што патрэбы творчых людзей рупліва задавальняліся. Менавіта дзякуючы Машэраву збылася мара многіх мастакоў: атрыманне кватэр з майстэрнямі. Ды і не толькі гэта. Проста не пералічыць тых прадстаўнікоў культурнага цэха, якім рэальна дапамог Пётр Міронавіч у вырашэнні іх надзённых пытанняў.

ЛЯ ВЫТОКАЎ УНІВЕРСІТЭТА КУЛЬТУРЫ

Станоўчыя зрухі адбыліся і ў адукацыйнай сістэме. Паспяхова быў ажыццёўлены пераход да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі. Эфектыўна ўкараняліся новыя навучальныя праграмы. З'явіліся вучэбна-вытворчыя камбінаты. Пётр Міронавіч належна ацэньваў настаўніцкую працу. Ён рашуча выступіў за правядзенне школьнай рэформы. І толькі заўчасны сыход з жыцця перашкодзіў рэалізацыі даўняга намеру гэтага дзеяча: прысвяціць адзінаццатую пяцігодку школе. Машэраў загінуў у аўтакатастрофе, калі дзясятая пяцігодка блізілася да свайго завяршэння.

Менавіта тады ў Беларусі з'явіліся многія навучальныя ўстановы, якія актыўна дзейнічаюць і па сёння. У іх ліку — Мінскі інстытут культуры (цяпер Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў). З 1965 па 1980 гады колькасць выпускнікоў ВНУ БССР падвоілася.

Пётр Міронавіч пастаянна ўнікаў у справы Акадэміі навук БССР. Менавіта па яго "блаславенні" прайшла рэканструкцыя галоўнага корпуса, быў здадзены пад ключ акадэмгарадок у Сцяпянцы, адкрытыя новыя НДІ. І здабыткі беларускіх навукоўцаў не прымусілі сябе чакаць. Колькасць лаўрэатаў Ленінскай прэміі адчувальна расла, а 12 прадстаўнікоў беларускай навуковай эліты папоўнілі корпус Герояў Сацыялістычнай Працы. Гэта больш, чым за ўсю папярэднюю гісторыю нашай навукі!

Я быў на пахаванні Машэрава. Добра памятаю выступ прэзідэнта АН БССР Мікалая Барысевіча на жалобным мітынгу. Акадэмік распавядаў, што за дзень да смерці Пётр Міронавіч прымаў навукоўцаў і ставіў перад імі сур'ёзныя задачы, звязаныя з экалагічнай бяспекай дзяржавы. У той час, калі на гэтую тэму яшчэ мала хто задумваўся.

■■■

Таму, нягледзячы на ўсе хібы той эпохі ў жыцці Беларусі, у нас ёсць усе падставы сцвярджаць, што першы сакратар ЦК КПБ значна паспрыяў развіццю культуры, адукацыі і навукі ў БССР. Кім жа быў Машэраў для нашай мовы і культуры, адказ можна сфармуляваць вельмі проста. Ён быў дзіцём свайго часу.

Міхаіл СТРАЛЕЦ,
доктар гістарычных навук,
прафесар

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:
- "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.";
- "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст.";
- "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.";
- "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.";
- "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.";
- "Мастацтва краін Усходу XIV — XX стст.".

Выставы:
- Выставачны праект **"Святыя непадзеленай Царквы"** — да 20 лютага.
- Выстава **"Леанід Шчамялёў. Жывапіс"** (да 95-годдзя з дня нараджэння народнага мастака Беларусі) — да 18 лютага.
- Выстава графічных твораў Анатоля Александровіча (1953 — 2017) **"Паміж словам і вобразам"** — да 11 сакавіка.
- Выстава **"Айчыне служым!"** (да 100-годдзя Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь) — да 15 мая.
- Выстава Вольгі Угрыновіч **"У сутворчасці з прыродай"** (фарфор, жывапіс) — да 4 сакавіка ў арт-кафэ музея.
- Віртуальная выстава **"Настальгія па зіме. Сем зімовых пейзажаў Абрама Кроля"**.
- **"Вясновае свята-2018, або Усходні Новы год"** (культурнае падарожжа па традыцыях КНР, Рэспублікі Карэя і Японіі) — 18 лютага. Пачатак а 12-й.

Філіялы музея

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І ПАЛОВЫ XIX ст."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.

Пастаянныя экспазіцыі:
- **"Інтэр'еры шляхецкай сядзібы"**.
- **"Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча"**.
- **"Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст."**.
- Выстава графікі Івана Шышкіна са збораў музея — з 20 лютага да 15 красавіка.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.
- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстава **"Жаночы сусвет"** — да 11 сакавіка.
- Лекторый **"За кубачкам гарбаты"** (серыя інтэрактыўных лекцый пра чатыры віды народнай творчасці). 17 лютага — "Саломапляценне", 24 лютага — "Народны строй". Пачатак лекцый а 12-й.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 327 43 22.

Экспазіцыі:
- Абноўленая экспазіцыя **"Старажытная Беларусь"**.
- "Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".
- Бестэрміновая акцыя **"Адзіны білет"**, якая дазваляе мінчанам і гасцям сталіцы наведаць музей і яго шэсць філіялаў, набыўшы ўсяго адзін білет у любым з іх.
- Аўтарскі праект Ахрэма Белабровіка **VKL3D**.
- Акцыя **"Вольнае піяніна"** — кожны дзень з 16.00 да 19.00.

Выставы:
- Выстава **"Беларусь: адраджэнне духоўнасці"**.
- Выстава **"Ад рымскага дэнарыя да беларускага рубля"**.
- Часовая экспазіцыя **"Традыцыйная мастацкая культура Беларусі"** — да 25 лютага.
- Выстава **"Great Britain"** (сумесны адукацыйны праект мастачкі Антаніны Петрыкоўскай і музея) — да 18 лютага.
- Выстава жывапісу Ганны Конанавай **"Сонечная вяршыня"** — да 25 лютага.
- Выстава твораў Настассі Балыш **"Таямніцы святла"** — да 17 лютага ў музейнай прасторы "Галерэя".

Філіялы музея

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДУ РСДРП

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.
- **Абноўленая экспазіцыя**, прымеркаваная да 100–годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі (залы дапоўненыя новымі прадметамі амаль з усіх фондавых калекцый музея).
- Экспазіцыйны праект **"Мінск 1917"**, прысвечаны гісторыі горада ў рэвалюцыйны 1917 год — да 11 сакавіка.
- Аўтарская выстава фатаграфіі А.Лінэмана **"13-е Акно"** — да 25 лютага.

МУЗЕЙ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 38.
Тэл.: 327 46 11.
- Пастаянная экспазіцыя.

МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ І ЭКАЛОГІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 327 06 33.

Экспазіцыі:
- "Сезонныя змены".
- "Вадаёмы і насельнікі прыбярэжных раслін".
- "Хвойны тып лесу і насельнікі змяшанага лесу".
- "Насельнікі ліставога і змяшанага лесу".
- "Ахоўныя прыродныя ўчасткі, рэдкія віды жывёл".
- Выстава **"Жывыя цмокі"** — да 25 лютага.

г. Мінск, вул. Казінца, 117 (будынак кінатэатра "Электрон").
Тэл.: +37529 123 60 53.
- Выстава **"Сафары парк"**.
- Атракцыён **"Стужачны лабірынт"**.
- Атракцыён **"Лазерны квэст"**.

г. Мінск, вул. Багдановіча, 9а.
Тэл.: 237 46 94.
- Выстава архідэй — да 1 красавіка.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ТЭАТРАЛЬНАЙ І МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

г. Мінск, Музычны зав., 5.
Тэл.: 220 26 67.

Пастаянныя экспазіцыі:
- "Вытокі тэатральнай і музычнай культуры на беларускіх землях"; "Музычная і тэатральная культура Беларусі ў X — XIX стст."; "Беларуская музычная культура XX ст."; "Тэатральная культура Беларусі XX ст.".

ГАСЦЁЎНЯ УЛАДЗІСЛАВА ГАЛУБКА

г. Мінск, вул. Старавіленская, 14. Тэл.: 286 74 03.
- Пастаянная экспазіцыя.

Майстар-класы:
- Музейныя заняткі **"Тэатральная лялька"** для дзяцей 5+.
- Інтэрактыўныя музейныя заняткі **"Асновы акцёрскага майстэрства"** для дзяцей ад 5 да 10 гадоў.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА КІНО

г. Мінск, вул. Свярдлова, 4.
Тэл.: 327 10 75.
- Пастаянная экспазіцыя.
- **"Асаблівая фатаграфія"** (першая выстава Секцыі аналагавай фатаграфіі Беларускага аб'яднання фатографаў) — да 18 лютага.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8.
Тэл: 327 11 66; 203 07 92.
Музей працуе: пн. — выхадны, аўт. — нядз. — ад 10-й да 18-й, сер. — ад 12-й да 20-й.
- Пастаянная экспазіцыя.
- Часовая экспазіцыя **"Пётр Машэраў: яго сэрца білася для людзей"** — да 13 жніўня.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.
Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02; +37529 551 80 51, + 37529 190 31 49.

Палацавы ансамбль
- Пастаянная экспазіцыя.
- Гістарычны квэст **"Таямніцы і загадкі палаца Радзівілаў"**. Па папярэдніх заяўках.

Сектар экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці
Вул. Гейсіка, 1.
- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстава **"Дуэт"** з калекцый майстроў выцінанкі Алены Шаліма і Наталлі Гамаюнавай.

Ратуша Вул. Савецкая, 3.
- Пастаянная экспазіцыя.
- Квэст **"Выхадкі старога захавальніка"**. Па папярэдніх заяўках.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: (8–01596) 2 82 91, (8–01596) 2 82 70.
- Пастаянная экспазіцыя.
- Міжнародная перасоўная выстава **"Лагер смерці Трасцянец. Гісторыя і памяць"** — да 25 лютага.
- Тэатралізаваная экскурсія **"І зноў ажываюць паданні"**.
- Экскурсія з элементамі дэгустацыі **"У госці да Пане Каханку"**.
- Дзіцячая тэатралізаваная экскурсія **"Чароўная гісторыя ў Мірскім замку"**.
- Музейныя заняткі.
- Музейная фотапляцоўка.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5.
Тэл.: 294 91 96.

Экспазіцыі:
- **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
- Экспазіцыя **"Склеп"** на сядзібе Якуба Коласа.
- Тэматычныя экскурсіі і лекцыйныя заняткі.
- Тэатралізаваныя прадстаўленні паводле беларускіх народных казак.
- Музейныя майстар-класы і заняткі.
- Мультымедыйны комплекс **"Чалавек. Асоба. Час"**.
- Пешая экскурсія **"Мясцінамі Коласа ў Мінску"**.
- Інтэрактыўныя праграмы для сямейных наведвальнікаў, квэст-гульня **"Таямніцы дома Песняра"**.
- Выстава **"Жывыя малюнкі, вобразы, сімвалы…"** (да 90-годдзя з дня нараджэння народнага мастака Беларусі Уладзіміра Стэльмашонка) — да 6 сакавіка.
- Выстава твораў Эдуарда Мацюшонка **"Адчуванне сябе…"** — да 28 лютага.
- Імпрэза **"Па старонках "Гістарычнага слоўніка беларускай мовы"**, прымеркаваная да Міжнароднага дня роднай мовы, — 22 лютага. Пачатак у 18.30.

Акцыі:
- **"Самы лепшы дзень"** (дзень нараджэння ў музеі).
- Віншаванне ад музея, фотасесія **"У дзень вяселля — у музей!"**

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4.
Тэл.: 327 78 66.

Экспазіцыі:
- Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.
- Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі"**, **"Вячоркі"**.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА

г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.

Філіялы Музея гісторыі горада Мінска

ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА

г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:
- **"Жыццёвы і творчы шлях народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва"**.
- Выстава жывапісу і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва **"Familia"** (прысвечана 95-годдзю Леаніда Шчамялёва) — да 11 сакавіка.

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА

г. Мінск, пл. Свабоды, 15.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:
- **"Мастак. Грамадзянін. Герой"**. Прысвечана Ганароваму грамадзяніну г. Мінска Міхаілу Савіцкаму.
- **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт"**.
- Выстава **"Мастацкая школа імя Яна Разэнталя"** — да 4 сакавіка.
- Выстава **"Леў Барадулін. Легенда спартыўнай фатаграфіі"** — да 25 лютага.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША

г. Мінск, пл. Свабоды, 2а.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:
- **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет"**.

МУЗЕЙ "ЛОШЫЦКАЯ СЯДЗІБА"

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 8.
- Пастаянная экспазіцыя.

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10.
Тэл.: 285 18 86.

Экспазіцыя:
- **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры кан. XIX — сяр. XX стст.

ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"

г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 8. Тэл.: 321 24 30.
- **"Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж"** (пастаянная экспазіцыя па гісторыі гужавога транспарту жыхароў Мінска XIX — пачатку XX стст.).
- Віртуальная гульня **"Карэтны майстар"**.

ЭКСПАЗІЦЫЯ "МІНСКАЯ КОННАЯ ЧЫГУНКА"

г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 6.
- Экспазіцыя складаецца з некалькіх раздзелаў, якія распавядаюць пра жыццё Мінска 1890 — 1920-х гг.

АРТ-ГАСЦЁЎНЯ "ВЫСОКАЕ М СТА"

г. Мінск, вул. Герцэна, 2а.
Тэл.: 321 24 30.
- Выстава мастацкага тэкстылю і касцюма **"Гіперсувязі"** студэнтаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў — да 25 лютага.

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ

г. Ліда, вул. Перамогі, 37а.
Тэл.: (8-0154) 53 50 64.

Пастаянныя экспазіцыі:
- **"Прырода Лідчыны"**.
- **"Сучаснае мастацтва краю"** (жывапіс, графіка, скульптура, мастацкае шкло).

Выставы:
- Выстава **"Майстэрня заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, сябра Саюза мастакоў Беларусі Уладзіміра Мурахвера"**.
- **"Вядзем пачатак мы ад Гедыміна..."**.
- Мемарыяльны пакой **Валянціна Таўлая**.
- Выстава са збору А.Фішбайна **"Рэчы побыту канца XIX — пачатку XX стст."**.
- Музейна-вобразная зала **"Хрушчоўка 60-х"**.
- Выстава **"Вайны свяшчэнныя старонкі"**.
- Выстава **"Надзейны шчыт краіны"**.
- Выстава **"Падарожжа ў гарадскі і сельскі побыт"**.
- Выстава **"Жыве мая ліра нанова!"**

ДОМ-МУЗЕЙ АДАМА МІЦКЕВІЧА Ў НАВАГРУДКУ

г. Навагрудак, вул. Леніна,1.
Тэл.: (8-01597) 2 43 40 (каса).
- Пастаянная экспазіцыя: **"Жыццё і творчасць Адама Міцкевіча"**.
- Пастаянныя выставы: **"Святло кухні Міцкевічаў", "Малюнкі сельскага жыцця", "Пан Тадэвуш" праз час і народы"**.

ГАЛЕРЭІ

"УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1.
Тэл.: 327 26 12.
- Выстава твораў Аляксандра Адамава **"Азірніся на дом свой"** — да 21 лютага.
- Выстава карцін дагестанскага мастака і пісьменніка Марата Гаджыева **"Зунзул чані" ("Світанне")** — да 28 лютага.
- Выстава работ удзельнікаў Кубка Беларусі па мастацкай творчасці ў рамках II Міжнароднага фестывалю-конкурсу дзіцяча-маладзёжнай творчасці **"Асамблея мастацтваў"** — да 21 лютага.
- Выстава тэкстылю студэнтаў Латвійскай акадэміі мастацтваў.

У МІНСКУ ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" МОЖНА НАБЫЦЬ У НАСТУПНЫХ КРОПКАХ:

МАГАЗІНЫ "БЕЛСАЮЗДРУК"
- **Падземны пераход ст.м. "Пятроўшчына".**
- **Падземны пераход ст.м. "Плошча Перамогі".**
- **Праспект Незалежнасці, 44.**
- **Вуліца Валадарскага, 16.**

КІЁСКІ "БЕЛСАЮЗДРУК"
- **ст.м. "Няміга", вул. М. Багдановіча.**
- **Праспект Пераможцаў, 5.**
- **Вуліца Рабкораўская, 17.**
- **Праспект Незалежнасці,168, В.**
- **Вуліца Лабанка, 2.**

Па пытаннях размяшчэння рэкламы ў газеце "Культура" звяртайцеся па тэлефоне + 375 17 286 07 97 і па тэлефоне/факсе +375 17 334 57 41, альбо пішыце на электронны адрас kultura@tut.by!

ТЭАТРЫ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1. Тэл./факс: 334 11 56.
- **17 — "Іяланта"** (опера ў 2-х дзеях) П.Чайкоўскага. Пачатак а 12-й і а 19-й.
- **18 — "Лебядзінае возера"** (балет у 3-х дзеях) П.Чайкоўскага. Пачатак а 18-й.
- **18 — "Тэатральны карнавал"** (выконваюць вядучыя салісты оперы, інструментальнае трыа Gloria). Камерная зала імя Л.П.Александроўскай. Пачатак у 18.30.
- **23 — "Viva la mama!" ("Няхай жыве мама!")** (опера ў 2-х дзеях) Г.Даніцэці. Камерная зала імя Л.П.Александроўскай. Пачатак у 19.30.
- **24 — "Тоска"** (опера ў 3-х дзеях) Дж.Пучыні. Прэм'ера. Дырыжор — Джанлука Марчана.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44.
Тэл./факс: 334 60 08.
- **17 — "А мне не соромна!.."** (больш чым казка) Л.Усцінава. Пачатак аб 11-й.
- **17 — "Любоў людзей"** (трылер) Д.Багаслаўскага.
- **18 — "Тры Жызэлі"** (драма) А.Курэйчыка.
- **19 — "ПЛАСТформа. Choreo content"** (вечар сучаснай харэаграфіі).
- **20 — "Беларусь. Дыдактыка"** (праект з удзелам народнай артысткі Рэспублікі Беларусь Тацяны Мархель). Прэм'ера.
- **21 — "Раскіданае гняздо"** (народная трагедыя) Янкі Купалы.
- **22 — "Пакуты ад здаровага сэнсу"** (камічная прыпавесць) С.Рубэ. Прэм'ера.
- **23 — "Кар'ера доктара Рауса"** (гістарычна недакладная трагікамедыя) В.Марціновіча. Прэм'ера.
- **24 — "Воўк-мараплавец"** (музычная казка) С.Казлова. Пачатак аб 11-й.
- **24 — "Нязваны госць"** (сямейная меладрама) С.Бартохавай.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2. Тэл.: (8-0212) 36 32 50.
- **18 — "Сонейка і снежныя чалавечкі"** (зімовая казка) А.Весялова. Пачатак аб 11-й.
- **24 — "Тук-тук! Хто там?"** (спектакль-музычная рэпетыцыя на 2 дзеі) Л.Ралчава. Пачатак аб 11-й.

УВАГА!
ТУТ МАГЛА БЫЦЬ ВАША АФІША!
Звяртайцеся:
+375 17 286 07 97,
+375 17 334 57 41 (факс)
kultura@tut.by